WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

29 КАСТРЫЧНІКА 2011 г.
СУБОТА
№ 207
(27071)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка: «Беларусь гатова дамаўляцца з Таджыкістанам па любых пытаннях»

Аб гэтым Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў на сустрэчы ў вузкім складзе з Прэзідэнтам Таджыкістана Эмамалі Рахмонам, перадае БЕЛТА.

«Мы абсалютна адкрытыя ў нашых адносінах з Таджыкістанам. Будзьце ўпэўнены, што мы гэту палітыку будзем пастаянна праводзіць. Закрытых тэм няма. Мы гатовы размаўляць і дамаўляцца па любых пытаннях», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. У сваю чаргу Прэзідэнт Таджыкістана таксама цёпла вітаў Аляксандра Лукашэнку, адзначыўшы, што беларуская дэлегацыя прывезла Таджыкістану своеасаблівы падарунак у выглядзе дажджу, якога ў краіне не было працяглы перыяд. «Вельмі рады сустрэцца і абмеркаваць нашы адносіны», — сказаў Эмамалі Рахмон.

Як адзначыў Прэзідэнт Беларусі, нягледзячы на геаграфічную аддаленасць, народы дзвюх краін не адно дзесяцігоддзе аб'ядноўвае цеснае супрацоўніцтва і ўзаемадапамога. «Таджыкістан для нас — важны партнёр у Цэнтральнай Азіі. Пацвярджэннем таго з'яўляецца цяперашні візіт і грунтоўная зацікаўленая размова, якая адбылася з Эмамалі Рахмонам», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Прэзідэнты Беларусі і Таджыкістана Аляксандр Лукашэнка і Эмамалі Рахмон падпісалі ў Душанбэ дагавор паміж дзвюма краінамі аб доўгатэрміновым гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве. Кіраўнікі дзяржаў таксама падпісалі міждзяржаўную праграму доўгатэрміновага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і Таджыкістанам на 2011-2020 гады. Акрамя таго, падпісаны міжурадавае пагадненне аб працоўнай дзейнасці грамадзян Беларусі ў Таджыкістане і грамадзян Таджыкістана ў Беларусі, пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Мінэканомікі Беларусі і Міністэрствам эканамічнага развіцця і гандлю Таджыкістана. Таксама падпісаны пагадненні паміж адпаведнымі галіновымі ведамствамі дзвюх краін аб супрацоўніцтве ў галіне папярэджання надзвычайных сітуацый, моладзевай палітыкі, у галіне культуры і мастацтва. Беларусь і Таджыкістан дамовіліся развіваць вытворчую кааперацыю і ствараць сумесныя вытворчасці. Аб гэтым гаворыцца ў сумесным заяве кіраўнікоў дзяржаў Аляксандра Лукашэнкі і Эмамалі Рахмона, якую яны падпісалі па выніках перагавораў у Душанбэ. Канстатуючы канструктыўны характар перагавораў, праведзеных у духу ўзаемаразумення і высокага даверу, бакі даручылі ўрадам абедзвюх дзяржаў сканцэнтраваць намаганні на прыярытэтных напрамках эканамічнага, навукова-тэхнічнага і гуманітарнага ўзаемадзеяння. Сярод прыярытэтных напрамкаў значацца развіццё ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва ў адпаведнасці з існуючымі ў гэтай сферы двухбаковымі дамоўленасцямі і міжнароднымі абавязацельствамі абедзвюх дзяржаў, пашырэнне супрацоўніцтва ў аграпрамысловым комплексе, машынабудаванні, нафтахімічнай галіне, транспартнай, энергетычнай сферах, харчовай і лёгкай галінах прамысловасці, актывізацыя навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва, актыўнае развіццё міжрэгіянальных сувязяў, пашырэнне ўзаемадзеяння ў сферах аховы здароўя, культуры, спорту, турызму, адукацыі.

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прапануе Таджыкістану прыняць удзел у прыватызацыі Баранавіцкага баваўнянага камбіната. «Мы разгледзім варыянты, да нас прыедуць вашы спецыялісты, каб паглядзець наш баваўняны камбінат. Я гатовы да акцыянавання і прыватызацыі гэтага прадпрыемства. Мы гатовы разгледзець гэта пытанне, працаваць у гэтым плане, каб выйсці на прыватызацыю гэтага камбіната з Таджыкістанам, Расіяй», — заявіў кіраўнік дзяржавы. Пры гэтым ён адзначыў выгаднасць развіцця супрацоўніцтва з Таджыкістанам, паколькі пры гэтым не ставіцца ніякіх палітычных умоў. Акрамя таго, паводле слоў кіраўніка беларускай дзяржавы, вывучана пытанне аб стварэнні на поўдні Таджыкістана сумеснага прадпрыемства па выпуску беларускіх трактароў. Беларускі бок гатовы пастаўляць у Таджыкістан камбайны і іншую сельскагаспадарчую тэхніку. «Мы зацікаўлены ў павелічэнні паставак сюды тэхнікі, у тым ліку з разліку сумеснага гандлю з трэцімі краінамі», — адзначыў Прэзідэнт. «Нам гэта цікава таму, што Беларусь і Таджыкістан змогуць гандляваць сумесныя прадукцыяй, вырабленай у Таджыкістане», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. У прыватнасці, паводле яго слоў, ёсць перспектывы паставак гэтай тэхнікі ў Афганістан, Пакістан, Іран, Кітай.

Таджыкістан зацікаўлены ў паступальным развіцці адносін з Беларуссю. Аб гэтым заявіў на перагаворах з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам у пашыраным складзе Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон.

Таджыкістан прапануе адкрываць на сваёй тэрыторыі філіялы беларускіх ВНУ. Аб гэтым паведаміў журналістам у Душанбэ Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік беларускай дзяржавы сказаў, што ў адным з універсітэтаў Таджыкістана будзе адкрыты сумесны факультэт. «Прэзідэнт Таджыкістана Эмамалі Рахмон прапанаваў, каб мы ад факультэта перайшлі да філіялаў беларускіх ВНУ на таджыкскай зямлі. Лічу, што ў гэтым ёсць вялікая перспектыва».

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падзякаваў таджыкскаму лідару за сардэчны прыём. «Стасункі на вышэйшым узроўні ў нас адбываюцца рэгулярна. Як сказаў Эмамалі Шарыпавіч, у нас ніколі не было і, я перакананы, што не будзе нявырашаных пытанняў і рознагалоссяў», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы. Ён адзначыў вялікія поспехі ў развіцці Таджыкістана за апошнія гады, а таксама пазітыўную дынаміку гандлёва-эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі. Так, па выніках 2010 года тавараабарот паміж Беларуссю і Таджыкістанам у параўнанні з узроўнем 2000 года павялічыўся ў 9 разоў.

Жывая зямля

КОЛАСАВЫМ ЛІПАМ — 100 ГАДОЎ!

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У гэтыя дні на Коласавай сядзібе «Смольня» — юбілей. Роўна сто гадоў споўнілася ліпам, якія растуць уздоўж паэтавай хаты. Іх пасадзіў яшчэ маладым Якуб Колас. Вядома, што ў Смольню паэт прыехаў у верасні 1911 года пасля Мінскага астрога, у якім адседзеў тры гады. Прыякіх абставінах і якой нагоды былі пасаджаны гэтыя дрэвы, я вырашыў даведацца ў Софі Пятроўны Міцкевіч — загадчыцы філіяла літаратурнага музея Якуба Коласа, і пазваніў да яе на Стаўбцоўшчыну.

— Паколькі на гэтай радзівілавай зямлі стаяла толькі хата, якую дзядзька Антось сплавіў па Нёмане з вёскі Яршы, і нічога болей не было, Колас і прапанаваў упрыгожыць сядзібу дрэўцамі, — сказала Софʼя Пятроўна. — Сам пасадзіў тры ліпы. Астатнія — дзядзька Антось і брат Уладзя. Саджанцы далі яшчэ два парасткі, і атрымалася ажно пяць Коласавых ліп.

Маюць падставу і іншыя версіі: магчыма, гэткім чынам Колас адзначыў сваё вызваленне з астрога. Альбо вырашыў зрабіць сабе падарунак — 3 лістапада ў народнага паэта дзень народзінаў.

У лістападзе праезд ва ўсіх відах грамадскага транспарту Мінска павысіцца да Br1300

Тарыф на гарадскія перавозкі пасажыраў усімі відамі транспарту ў рэгулярных зносінах (за выключэннем маршрутных таксі) устанаўліваецца ў памеры не большым за Br1300 за адну паездку, экспрэсных рэгулярных маршрутаў у памеры не большым за Br1800 за адну паездку, прыгарадных перавозках пасажыраў на звычайных маршрутах у аўтобусах агульнага тыпу ў памеры Br220 за 1 км праезду.

Рэгуляванне тарыфаў адмяняецца на перавозкі пасажыраў у рэгулярных зносінах аўтамабілямі з дазволенай максімальнай масай менш як 5000 кг (маршрутка). Юрыдычныя асобы і індывідуальныя прадпрымальнікі будуць самастойна ўстанаўліваць тарыфы на перавозкі пасажыраў гарадскімі аўтобусамі з дазволенай максімальнай масай менш як 5000 кг экспрэсных рэгулярных маршрутаў на аснове планавых затрат, падаткаў і іншых абавязковых плацяжоў, устаноўленых заканадаўствам, і прыбытку, з улікам кан'юнктуры рынку, разлічанай зыходзячы з нарматыву рэнтабельнасці не больш як 15 працэнтаў.

Плануюцца таксама іншыя змяненні ў сістэме аплаты праезду ў пасажырскім транспарце Мінска, паведамляецца на сайце ДУ «Сталічны транспарт і сувязь».

Новыя тарыфы пачнуць дзейнічаць пасля афіцыйнага апублікавання ў СМІ.

БЕЛТА.

Пенсіі

З 1 лістапада пенсіі вырастуць у сярэднім на 22%

Беларускія пенсіянеры і надалей не застануцца без увагі і падтрымкі дзяржавы

Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна Каралёва паведаміла, што з 1 лістапада будзе праведзены пераразлік працоўных пенсій, зыходзячы з сярэдняй заработнай платы работніка ў краіне за трэці квартал 2011 года (паводле інфармацыі Белстата, яна склала 2 млн 36 тыс 500 рублёў). Гэта робіцца ў адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 26 ліпеня 2011 года №327.

Нагадаем, што цяперашняе павышэнне працоўных пенсій, заснаванае на росце сярэдняй заработнай платы, ужо трэцяе ў гэтым годзе. Папярэднія былі зроблены ў чэрвені і жніўні.

Акрамя таго, у лістападзе будуць пераразлічаны мінімальныя працоўныя і сацыяльныя пенсіі, а таксама надбаўкі і павышэнні да пенсій у сувязі з ростам бюджэту пражыткоўага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. У выніку пераразлікаў пенсіі ў лістападзе павялічацца ў сярэднім на 22%, паведаміла Валянціна Каралёва. Пры гэтым памер павелічэння пенсіі ў кожнага пенсіянера будзе залежаць ад індывідуальных параметраў яго стажу работы і заробку, а таксама іншых звестак, зафіксаваных у матэрыялах пенсійнай справы (у тым ліку і ад наяўнасці права на надбаўкі і павышэнні да пенсіі).

Паводле ацэнкі, сярэдняя пенсія па ўзросце ў лістападзе 2011 года складзе 978 тыс рублёў, пенсія пры стажы 45/40 гадоў і індывідуальным каэфіцыенце заробку пенсіянера 4,0 — 1 млн 504 тыс. 400 рублёў.

Фінансаванне расходаў на павышэнне пенсій будзе ажыццяўляцца са сродкаў Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь. Дадатковыя расходы на гэтыя мэты складуць 435,5 млрд рублёў. У цэлым на выплату пенсій, пачынаючы з лістапада, штомесяц будзе расходавацца каля 2,4 трлн рублёў. Намеснік міністра падкрэсліла, што неабходныя для гэтага сродкі Фонд мае.

Сёння пенсіянеры складаюць 27% насельніцтва нашай краіны. З іх большасць (2,4 млн чалавек) атрымлівае пенсіі ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне. Пытанні падтрымкі непрацаздольных грамадзян знаходзяцца на пастаянным кантролі дзяржавы, адзначыла Валянціна Каралёва і запэўніла, што і надалей пенсіянеры не застануцца без увагі і падтрымкі дзяржавы.

Інга МІНДАЛЁВА.

У БЕЛАРУСІ СТВОРАЦЬ БЕЛАРУСКАМОЎНЫ КАНАЛ «БЕЛАРУСЬ-3»

Зусім хутка на змену тэлеканалам «Першы», «ЛАД» і «Беларусь-ТБ» прыйдуць тэлеканалы «Беларусь-1», «Беларусь-2» і «Беларусь-24». Рэбрэндзінг распачнецца ўжо з 5 лістапада.

— Мы верым, што ў нас усё атрымаецца, — зазначыў падчас прэс-канферэнцыі **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Генадзь ДАВЫДЗЬКА.** — З гэтага часу кожны канал будзе мець сваю сферу дзейнасці. У аддаленай будучыні, хутчэй за ўсё ў наступным годзе, мы плануем запусціць яшчэ і тэлеканал «Беларусь-3», які будзе вяшчаць цалкам па-беларуску.

У абноўленым фармаце перад гледачамі прадстануць абноўленыя праграмы з мінулых сезонаў, а таксама зусім новыя перадачы і токшоу. У прыватнасці, з'явяцца такія праграмы, як «Да цешчы на бліны» з Эміліяй Пранскутэ і «Толькі жанчына ведае» з Тамарай Лісіцкай. З'явяцца ў эфір і новыя твары — у прыватнасці, новыя вядучыя навін. Больш падрабязна пра ўсе навінкі новага сезона на Белтэлерадыёкампаніі — у бліжэйшых нумарах «Звязды».

Ілья ЛАПАТО.

Дыскусійная трыбуна

РОДНАЯ МОВА — НЕ ПАПУЛЯРНАЯ. ПАКУЛЬ?

«Ну вось мы і дажыліся, што даводзіцца папулярызаваць родную мову!» — сумна заўважыла адна з маіх суразмоўніц у Магілёве. Прыкра? Безумоўна. Але такая рэальнасць! Ад яе спрабуюць адштурхнуцца рэгіянальныя ўлады, медыя, культурныя ўстановы і ўвогуле прыхільнікі беларускай мовы, каб пайсці далей і вярнуць мову ў шырокі ўжытак.

Згадка пра адметнасць

У Магілёўскай вобласці ўжо другі год працуе комплекс першачарговых мер па папулярызацыі беларускай мовы. Ён разлічаны на тры гады, да 2012-га ўключна.

— Гэты план — міжведамасны, і ён закранае розныя сферы жыцця, — тлумачыць **галоўны спецыяліст упраўлення ідэалагічнай працы Магілёўскага аблвыканкама Жанна ДЗМІТРЫЕВА.** — Падобныя комплексы мер ёсць у кожным раёне. Нам трэба было страсянуць усіх па гэтай тэме, абавязкова. У нас сапраўды афіцыйна двухмоўе, але на сваю родную мову, калі шчыра, забываюцца.

Жанна Анатольеўна мае адукацыю настаўніцы беларускай мовы і літаратуры. Таму папулярызацыя роднай мовы — не проста праца, а тэма, якая яе сапраўды хвалюе. Жанна Дзмітрыева калісьці пачала працаваць у гэтым кірунку з вывучэння вуліц Магілёва і не атрымала добрага ўражання.

— Калі б сюды закінуць чалавека, то ён бы і не разабраўся, у якой краіне знаходзіцца: назвы ёсць па-руску і па-англійску, але не па-беларуску, — гаворыць яна. — Калі пытаешся ў начальнікаў, чаму не напісаць на шыльдзе назву ўстановы альбо афарміць рэкламу таксама і на беларускай мове, то аказваецца, што ў большасці з іх пра гэта і думак не было. Але яны павінны быць, бо гэта наша адметнасць!

Цяпер службовы абавязак Жанны Дзмітрыевай — нагадваць, што родная мова існуе. Яна збірае справаздачы з усёй вобласці пра тое, як ідзе выкананне комплексу мер па папулярызацыі беларускасці.

— Вынікі ёсць, — цвёрда гаворыць спецыяліст. — Але хацелася б, каб яны былі лепшымі.

Прэміі за беларускасць

Вялізная папка са стосам папер. Многія са справаздач, калі шчыра, чытаць даволі сумна. Не тое што яны ўжо зусім фармальныя. Можа, больш правільнае слова — звыклыя. Большасць фактаў па прасоўванні беларускай мовы ў масы датычыцца школ, бібліятэк, устаноў культуры. Хвілінкі мовы, стэнды пра змяненні арфаграфіі, школьныя факультатывы, гурткі, народныя святы, віктарыны і вечарыны... і гэтак далей.

Але сярод гэтага папяровага «мора» знаходзяцца сапраўды цікавыя факты. Напрыклад, у шэрагу раёнаў заснаваны прэміі, якія носяць імёны знакамітых беларускіх пісьменнікаў-землякоў і прысуджаюцца за папулярызацыю беларускай мовы. У Касцюковічах гэтая прэмія носіць імя Івана Чыгрынава, у Бабруйску — Міхася Лынькова, у Горках — Максіма Гарэцкага, а ў Краснаполлі — Аляксея Пысіна. Дарэчы, у Краснаполлі яе аднойчы ўжо прысуджалі: ветэрану працы Тамары Жэбінай, аўтару зборніка вершаў «А васілёк шапоча ў жыце...»

У многіх ЗАГСах вобласці (напрыклад, у Бабруйску) прапануюць рэгістрацыю шлюбаў і іншыя ўрачыстасці правесці па-беларуску. Але пасапраўднаму паслуга для маладых стала папулярная ў Чавускім раённым гісторыка-краязнаўчым музеі. Там маладым і іх вясельным гасцям праводзяць цікавую экскурсію пра шлюбныя традыцыі, абрады і прыметы. Вядома, што за год такой паслуг гай скарысталіся 34 чавускія пары.

У старажытным Мсціславе апошнімі гадамі назіраецца сапраўдны прарыў у рэчышчы папулярызацыі нацыянальнай культуры разам з «Рыцарскім фэстам», які нарошчвае сваю папулярнасць. Таму невыпадкова, што каля месца правядзення рыцарскіх турніраў з'явіўся мемарыяльны памятны знак славутаму чалавеку Сямёну Лугвену, і прысвячэнне на тым помніку зроблена па-беларуску: «...роданачальніку мсціслаўскіх князёў, герою Грунвальдскай бітвы, фундатару праваслаўных святынь».

Рэклама на роднай мове

У справе папулярызацыі беларускай мовы вялікую ролю ўлады адводзяць і медыя. Працэнт ужытку роднай мовы ў розных газетах розны. Найлепшым прыкладам у гэтай справе ўзгадваюць заўсёды газету Бялыніцкага раёна «Зара над Друццю». «Раёнка» цалкам беларускамоўная, сайт — таксама, галоўны рэдактар Міхась Карпечанка размаўляе на роднай мове, і гэта не мае ніякага негатыўнага ўплыву на цікавасць людзей да друкаванага слова. Наадварот!

Свой уклад у агульны працэс уносіць і тэлебачанне: навіны дзяржаўнай рэгіянальная студыя тэлебачання робіць па-беларуску.

— Хто, калі не мы? — рытарычна пытаецца **дырэктар тэлерадыёкампаніі «Магілёў» Ірына АКУЛОВІЧ.** — Журналісты навучыліся працаваць на роднай мове, і ўжо не па кожнае слова звяртаюцца да слоўнікаў. Здараецца, што ў думках спачатку з'яўляецца менавіта беларускае слова, часам больш трапнае за рускі аналаг.

Але часам у рэдактарскай здараюцца і вялікія спрэчкі наконт правільных канчаткаў і рэдкіх слоў. Напрыклад, калі расказвалі пра новы завод па вытворчасці падгузнікаў. Ніяк не маглі вырашыць, як усё ж правільна: «падгузкі» альбо «падгузнікі». Можа, і так, і гэтак, але ўсё ж спыніліся на больш зразумелым для гледача падгузніку.

— Мы робім і праграмы на беларускай мове, — нагадала Ірына Акуловіч. — Гэта «Тэра гісторыка», якая ў сёлетнім сезоне прысвечана народным святам і абрадам. А таксама лаканічны, але стыльны праект «Слоўца», дзе расказваецца пра паходжанне беларускіх слоў. Мяркуем выдаць яго на дыску, для патрэб школьных настаўнікаў беларускай мовы.

СТАР.3

Блізкая ўлада

«КРЭДЫТ НЕ ДАЮЦЬ. ЯК ДАБУДАВАЦЬ ДОМ?»

СТАРШЫНЯ Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР правёў «прамую лінію» з жыхарамі вобласці. Абсалютная большасць званкоў датычылі будаўніцтва і пакупкі жылля, правільней сказаць, немагчымасці атрымання крэдытаў і працягу альбо заканчэння будаўніцтва.

Многія з тых, хто дазваніўся, расказвалі тыповую гісторыю. Так супала (ці, можа, шматдзетныя бацькі больш будуюць, разлічваючы на крэдыт), але тэлефанавалі часцей маці альбо бацькі шматдзетных сем'яў і прасілі дапамогі ў выдзяленні крэдыту для далейшага будаўніцтва. Так, **Віталь Пятровіч з Пінскага раёна** мае на руках дагавор на льготны крэдыт для рэканструкцыі дома. Рэканструкцыя падразумявала дабудову другога паверха. Грошай няма, дом стаіць раскрыты, а пабудова драўляная — ёй пашкодзяць атмасферныя ападкі, калі тэрмінова не ўзвесці дах. Сваіх сродкаў у бацькі траіх дзяцей на гэта няма, ён разлічваў на крэдыт, таму і дазваніўся адзін з першых. Таксама **шматдзетная сям'я з вёскі Вялікія Арлы Столінскага раёна** знайшла варыянт пакупкі дома за 80 мільёнаў рублёў. Паводле заканадаўства, ім можна ўзяць ільготны крэдыт, але банкі апошнім часам адмаўляюць, спасылаючыся на недахоп сродкаў.

У вельмі складаную сітуацыю трапіла сям'я брастаўчан. **Алена, маці пяцярых дзяцей,** расказала кіраўніку вобласці сваю гісторыю. Раней яны з мужам здымалі трохпакаёвую кватэру ў абласным цэнтры і марылі пра свой дом, які хацелі пабудаваць у Мухаўцы (прыгарад Брэста — **С.Я.**), таму цярпліва чакалі ўчастак менавіта там. А калі шматдзетнай сям'і, нарэшце, выдзелілі ўчастак пад будаўніцтва, пачаліся вядомыя эканамічныя цяжкасці і рост цэн. Сям'я паспела толькі ўзяць крэдыт і правесці падрыхтоўчыя работы, заліць фундамент. Таму Алена праспала дапамагчы не толькі з крэдытам, але і ў пошуках часовага жылля — блока ў інтэрнаце ці кватэры з гарадскога падменнага фонду. Бо здымаць жыллё, як раней, сям'я ўжо не можа па прычыне яго дарагоўлі. Яны і так пэўны час жывуць у знаёмых, але злоўжываць гасціннасцю людзей становіцца ўсё больш няёмка.

Прадстаўнікі кіраўніцтва гарвыканкама атрымалі даручэнне неадкладна дапамагчы гэтай сям'і. Агульная ж устаноўка, дадзеная кіраўніком вобласці ўсім кампетэнтным службовым асобам, — вынайсці сродкі і пракрэдытаваць людзей, якія пачалі будаўніцтва. «Нельга не звярнуць увагу на грамадзян, якія будуюць дамы для шматдзетнай сям'і, — сказаў Канстанцін Сумар. — У чалавека няма даху над галавой, а зіма набліжаецца. Мы не маем права пакідаць яго сам-насам з такой праблемай».

На наступны дзень была прызначана нарада па тэме крэдытавання будаўніцтва жылля для шматдзетных сямей.

Былі на «прамой лініі» пытанні па добраўпарадкаванні гарадоў і вёсак, па газіфікацыі вуліц і населеных пунктаў. Вельмі балючую тэму для многіх гараджан закранула **пінчанка Надзея Андрэеўна Мельнічук**, якая жыве ў старым доме па вуліцы Бялова. Яна некалі зрабіла памылку, што прыватызавала гэты дом. Бо не думала, што ён пачне разваліваццца, разлічвала, як патлумачыла жанчына, падрамантаваць дом: думала, што на яе век хопіць. А зараз 17 стоек трымаюць столь. І гараджанка апасаецца, што ў нейкі момант яна можа стаць бамжом. Ёй 65 гадоў, таму пабудаваць кватэру жанчыне ўжо не пад сілу.

У такой сітуацыі і дапамагчы складана. Надзеі Андрэеўне абяцалі разгледзець гэтую праблему. Напрыклад, калі яе жыллё трапляе пад забудову новага мікрараёна — тады, можна лічыць, што жанчыне пашанцавала. Але праблема ёсць, такіх людзей нямала ў гарадах. І іх не варта пакідаць без увагі, была ўстаноўка губернатара.

Пенсіянеркі з Беражнога Столінскага раёна паскардзіліся на тое, як пацярпелі... з-за ўласнай працавітасці. Жанчыны, адной з іх 79 гадоў, заключылі дагавор з мясцовай гаспадаркай на часовую работу — дапамагчы перабраць бульбу. А ў гэты час нашым грамадзянам выплачвалі па 500 000 рублёў дапамогі. У выніку па дакументах жанчыны лічацца як працуючыя пенсіянеры, і таму ім дапамогі не далі. Такім чынам, яны больш страцілі, чым зарабілі. Начальнік упраўлення па працы і сацыяльнай абароне паабяцаў пенсіянеркам аказаць дапамогу з іншага фонду.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.10.2011 г. (для б/н разлікаў)		Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ	
▼1 долар ЗША 8 500,00	1 чэшская крона 488,73	USD 29,8977	
▲1 еўра 12 040,00	1 польскі злоты 2 797,85	10 UAH 37,3628	
1 латвійскі лат 17 135,37	▲расійскі рубель 284,00	10000 BYR 35,0090	
1 літоўскі літ 3 494,92	1 украінская грыўня 1 062,23	EUR 42,3830	

Агенства Уладзіміра Гракова

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

УДЗЕНЬ СОНЕЧНА, УНАЧЫ ПАДМАРОЗІЦЬ ДА -6

І на выхадныя захаваецца малавоблачнае без ападкаў надвор'е, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

У суботу і нядзелю ўначы і раніцай туман. Тэмпература ўначы ад мінус 4 да плюс 4, месцамі пры праясненнях да 6 марозу. Удзень — 5—11 цяпла. У панядзелак павялічыцца воблачнасць, уначы на паўночным захадзе Беларусі, а ўдзень месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы ад мінус 1 да плюс 6, у Гомельскай і Магілёўскай абласцях — 2—5 марозу, удзень — 6—12 цяпла. Далей, ажно да чацвярга, чакаецца павялічэнне атмасфернага ціску і зноў будзе сонечна. Раніцай месцамі туман. Уначы ад мінус 2 да плюс 5, пры праясненнях да мінус 5, удзень — 7—13 цяпла.

ПАМЕРЫ КАМАНДЗІРОВАЧНЫХ У ЛІСТАПАДЗЕ ПАВЯЛІЧВАЮЦЦА ЎДВАЯ

Адпаведнай пастановай Міністэрства фінансаў вызначаны новыя памеры кампенсацыі расходаў пры службовых камандзіроўках, якія ажыццяўляюцца ў межах краіны.

Цяпер сутачныя складаюць 44 тыс. рублёў за кожны дзень камандзіроўкі. Сутачныя за аднадзённыя камандзіроўкі і пры службовых камандзіроўках у такую мясцовасць, адкуль ёсць магчымасць штодзённа вяртацца да месца жыхарства, складаюць 22 тыс. рублёў. Кампенсацыя за арэнду жылога памяшкання без прадастаўлення адпаведных дакументаў — 13 тыс. рублёў у суткі. Гэтае рашэнне пачынае дзейнічаць з 2 лістапада 2011 года.

Сяргей КУРКАЧ.

ЗВАДКАВАНЫ ГАЗ У БАЛОНАХ І НА АЎТАЗАПРАЎКАХ ПАДАРАЖЭ НА 10%

Гэта прадугледжана пастановай Міністэрства эканомікі № 174 ад 25 кастрычніка 2011 года, размешчанай на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале Беларусі.

Цана на звадкаваны газ для запраўкі газавых балонаў аб'ёмам 1 л (0,4 кг), 5 л (2,0 кг), 12 л (5,0 кг), 27 л (11,4 кг), які рэалізуецца насельніцтву, складзе Br2 170 за 1 кг. Гэтая пастанова ўваходзіць у сілу пасля яе афіцыйнага апублікавання, якое чакаецца 29 кастрычніка. Звадкаваны газ на аўтагазазапраўках Беларусі падаражэе на 10 працэнтаў. Гранічная мінімальная рознічная цана на звадкаваны газ для запраўкі аўтамабільнага транспарту пры рэалізацыі на аўтамабільных газазапраўчых станцыях складзе Br2860 за літр, гранічная максімальная — Br3080 за літр.

ЭЛЕКТРЫЧНАЯ І ЦЕПЛАВАЯ ЭНЕРГІЯ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ГРАМАДСКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ З 1 ЛІСТАПАДА ПАДАРАЖЭЕ НА 15%

Гаворка ідзе пра тарыфы на электрычную энергію, якая адпускаецца рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі электраэнергетыкі ДВА «Белэнерга» для гэтых катэгорый арганізацый, што вызначаюцца на ўзроўні тарыфаў на электрычную энергію для насельніцтва.

Да іх ліку адносяцца арганізацыі аховы здароўя, рэлігійныя арганізацыі, садоўніцкія таварыствы, дачныя і гаражныя кааператывы, а таксама кааператывы, якія ажыццяўляюць эксплуатацыю аўтамабільных стаянак, стацыянарныя ўстановы сацыяльнага абслугоўвання (дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў, дзіцячыя дамы-інтэрнаты для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, спецыяльныя дамы для ветэранаў, састарэлых і інвалідаў), дзіцячыя вёскі (гарадкі) і іншыя.

Таксама для гэтых катэгорый арганізацый з 1 лістапада на 3,2% павышаюцца тарыфы на цеплавую энергію, якая адпускаецца рэспубліканскімі ўнітарнымі прадпрыемствамі электраэнергетыкі ДВА «Белэнерга» на мяжы балансавай прыналежнасці цеплавых сетак.

БЕЛТА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

ИНФОРМАЦИЯ
о проведении аукциона без условий по продаже недвижимого имущества

	ЛОТ № 1
Адрес объекта и его наименование	- незавершенное законсервированное здание цеха товаров народного потребления (процент готовности – 94) общей площадью 1 615,2 м², с инвентарным номером 630/U-65916, начальная стоимость **475 800 000** рублей без учета НДС 20%; адрес: Молодечненский район, пос. Сосновый Бор. Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
	ЛОТ № 2
Адрес объекта и его наименование	- здание склада пиломатериалов общей площадью 437,3 м², с инвентарным номером 630/С-42188, начальная стоимость **111 300 000** рублей без учета НДС 20%; адрес: Молодечненский район, пос. Сосновый Бор. Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
	ЛОТ № 3
Адрес объекта и его наименование	- здание свинарника-откормочника общей площадью 802,8 м², с инвентарным номером 630/С-42388, начальная стоимость **192 272 404** рубля без учета НДС 20%; адрес: Молодечненский район, пос. Сосновый Бор. Шаг аукциона в размере 5% от предыдущей цены.
	ЛОТ № 4
Адрес объекта и его наименование	- здание свинарника-маточника общей площадью 750,7 м², с инвентарным номером 630/С-42387, начальная стоимость **81 405 276** рублей без учета НДС 20%; адрес: Молодечненский район, пос. Сосновый Бор. Шаг аукциона в размере 10% от предыдущей цены.
Порядок оплаты	Оплата в размере цены продажи объекта (за вычетом задатка) в течение 20 календарных дней на р/с Продавца с момента заключения договора купли-продажи, который будет заключен с Победителем в течение 10 дней после подписания результатов аукциона по лотам № 3–4, а по лотам № 1–2 договор купли-продажи будет заключен в течение 10 календарных дней с момента выделения земельных участков под каждый в отдельности отчуждаемый объект недвижимости.
Сумма задатка	5% от начальной цены на р/с 3012190930030 в отделении 932 ОАО «Белинвестбанк», г. Молодечно, МФО 153001739, УНП 600182305, ОКПО 04064333, получатель: СИКУП «УКС-Сервис»
Продавец	Торговое частное унитарное предприятие «Белкоопвнешторг Белкоопсоюза»
Организатор торгов	СИКУП «УКС-Сервис» г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1
Документы, представляемые для участия в аукционе	Заверенную банком копию платежного документа, подтверждающего внесение задатка; юридическим лицам – копию учредительных документов и свидетельства о регистрации, индивидуальным предпринимателям – нотариально заверенное свидетельство о государственной регистрации, физическим лицам – паспорт или иной документ, удостоверяющий личность
Информация по земельному участку	Объекты (лот № 1–2) находится на земельном участке площадью 3,5218 га с кадастровым номером 623882711101000019. Однако точные границы земельного участка под каждый Объект будут определены путем дополнительного согласования между Победителем торгов и Продавцом объекта, и зарегистрированы в установленном законодательством Республики Беларусь порядке, за счет средств Продавца, в срок не позднее 35 (тридцать пять) рабочих дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объект (лот № 3) находится на земельном участке площадью 0,4350 га с кадастровым номером 623882700098000029. Объект (лот № 4) находится на земельном участке площадью 0,4580 га с кадастровым номером 623882700098000028.
Конечный срок и адрес приема заявок	**08.11.2011 до 16⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис», тел.: (8 0176) 73 00 13, (факс) 75 19 20; 8 044 710 74 60
Дата, время и место проведения торгов	**11.11.2011 в 15⁰⁰,** г. Молодечно, ул. Мира, 15, каб. 1, СИКУП «УКС-Сервис»
Условия проведения аукциона	Продавец имеет право отказаться от аукциона за день до его проведения. Объекты (лоты № 3–4) обременены договором аренды; срок действия договора аренды по 29.02.2012.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БОЛЬШАСЦЬ УКРАІНЦАЎ АСЦЕРАГАЕЦЦА ПАЎТОРУ ЭКАНАМІЧНАГА КРЫЗІСУ

Большасць украінцаў (74,8%) асцерагаецца паўтору эканамічнага крызісу і амаль палова (48,2%) рыхтуецца да яго магчымага наступлення. Пра гэта сведчаць вынікі апытання, праведзенага ва Украіне міжнародным кадравым парталам HeadHunter, паведамляюць інфармагенцтвы.

Пры гэтым 26,5% украінцаў не рыхтуюцца да наступлення эканамічнага крызісу, 10,3% лічаць, што гэтага не будзе, 5,3% рэспандэнтаў яшчэ не задумваліся над гэтым пытаннем. У той жа час кожны сёмы апытаны сцвярджае, што за тры гады так і не справіўся з наступствамі крызісу 2008 года. Толькі 16,6% рэспандэнтаў адзначылі, што падзеі восені 2008 года не паўплывалі на іх.

КІТАЙ ГАТОВЫ ЎКЛАСЦІ Ў ВЫРАТАВАННЕ ЕЎРОПЫ 100 МЛРД ДОЛАРАЎ

Кітай разглядае магчымасць значных інвестыцый у Еўрапейскі фонд фінансавай стабільнасці (EFSF). Памер удзелу Пекіна ў EFSF будзе наўпрост залежаць ад унёскаў іншых дзяржаў, а таксама ад умоў супрацоўніцтва з фондам, паведамляе амерыканская дзелавая прэса са спасылкай на крыніцы ў кітайскім урадзе.

Чакаецца, што інвестыцыі Кітая ў фонд еўрапейскай эканомікі, якая гіне, могуць скласці ад 50 млрд да 100 млрд долараў. Аднак Кітай будзе чакаць гарантый.

САРКАЗІ: ПРЫНЯЦЦЕ ГРЭЦЫІ Ў ЕЎРАЗОНУ БЫЛО ПАМЫЛКАЙ

Прэзідэнт Францыі Мікаля Сарказі зрабіў нечаканую заяву, сказаўшы, што было памылкай дапускаць Грэцыю ў еўразону ў 2001 годзе.

У інтэрв'ю французскаму тэлебачанню Сарказі сказаў, што тады было не варта гэтага рабіць, паколькі прадстаўленыя ўладамі Грэцыі эканамічныя паказчыкі былі недакладнымі. Аднак у адказ на гэта міністр замежных спраў Грэцыі ў інтэрв'ю Бі-бі-сі сказаў, што пры ўсіх сваіх праблемах Грэцыя не з'яўляецца прычынай цяперашняга пазыковага крызісу еўразоны. «Тое ж самае мы бачым у Партугаліі, Ірландыі, Іспаніі і Італіі. Бессэнсоўна рабіць адну краіну ахвярным казлом, калі маеш справу з агульнаеўрапейскай праблемай», — сказаў ён.

У БРЫТАНІІ ЗМЯНІЛІ ПРАВІЛЫ ПЕРАХОДУ Ў СПАДЧЫНУ ТРОНА

На саміце брытанскай Садружнасці нацый у аўстралійскім горадзе Пертэ зацверджаны змяненні ў Закон пра атрыманне прастола ў спадчыну брытанскай манархіі, якія ўраўноўваюць у правах мужчын і жанчын.

Выступаючы на саміце, прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Дэвід Кэмеран абвясціў, што змена азначае: калі ў прынца Уільяма і герцагіні Кембрыджскай першай народзіцца дзяўчынка, яна ўсё адно будзе першай у лініі пераходу ў спадчыну прастола, а браты будуць ісці за ёй. Зараз у Вялікабрытаніі дзейнічае Акт пра атрыманне трона ў спадчыну 1701 года, які ўстанавіў перавагі ўспадкоўвання трона па мужчынскай лініі. Паводле Акта, малодшыя браты маюць прыярытэтнае права на пасад перад старэйшымі сёстрамі.

У Маскве можна будзе зносіць перагародкі ў кватэрах без узгаднення. А як у нас?

У Маскве з 1 снежня значна спрашчаецца працэдура перапланіроўкі жылых і нежылых памяшканняў у шматкватэрных дамах.

Згодна з пастановай урада Масквы, узгадняцца будуць толькі тыя віды перапланіроўкі, якія рэальна ўплываюць на бяспеку пражывання ў доме.

Прыняты дакумент скасоўвае неабходнасць узгаднення наступных відаў работ: прылады рассоўных ці «карусельных» дзвярэй і вітрын з лёгкіх хуткаўзведзеных канструкцый без змены знешніх габарытаў памяшканняў; замены сталярных элементаў фасада; устанаўленне перагародак без павелічэння нагрузак на перакрыцці; змяненне матэрыялаў і пластыкі знешніх канструкцый, балконаў і лоджый; перастаноўкі награвальных (ацяпляльных) і газавых прыбораў без пракладкі дадатковых падводзячых сетак.

Для зручнасці масквічоў ім у хуткім часе прапануюць каля 130 варыянтаў тыпавых перапланіровак кватэр. Гэтыя праекты можна будзе ўбачыць і выбраць на сайце Маскамжылінспекцыі, а таксама на сайце Маскоўскага навукова-даследчага інстытута тыпавога і эксперыментальнага праектавання. Тыпавыя праекты, апублікаваныя на сайтах, распаўсюджваюцца на 70% жылых дамоў, дзе пражываюць 80% масквічоў.

Іх узгадненне будзе праходзіць у Маскамжылінспекцыі ў максімальна спрошчанай форме, у рэжыме «аднаго акна». Людзі самі павінны будуць выбраць варыянт перапланіроўкі, які ім падабаецца, і падаць заяву ў Маскамжылінспекцыю. Затым інспекцыя ўзгодніць праекты з Маскамархітэктурай. Калі ж перабудова закране вонкавае аблічча будынка, то спатрэбіцца ўзгадненне і з дэпартаментам культурнай спадчыны сталіцы.

З 127 тыпавых рашэнняў перапланіроўкі 57 не запатрабуюць ніякіх узгадненняў з Маскамжылінспекцыяй. Удзел чыноўнікаў будзе неабходны, калі ўласнік будзе ўзаконьваць перапланіроўку.

КАМЕНТАРЫЙ СПЕЦЫЯЛІСТА

Галоўны інжынер праектаў РУП «Інстытут «Белжылпраект» Аляксандра КІСЯЛЁВА:

— Гэта вельмі добры крок — публікацыя ў адкрытым доступе варыянтаў тыпавых перапланіровак, каб людзі ведалі, што можна рабіць, а што нельга. Гэта значна спрашчае жыццё.

Але дазваляць рабіць перапланіроўкі бескантрольна, без усялякіх узгадненняў, нельга. Напрыклад, вы хочаце, каб у вас над кухняй размяшчаўся санвузел суседа? Каб, калі ў яго прарве каналізацыю, усё гэта пацякло ў вашу кухню? Такія выпадкі былі. Пры гэтым сусед быццам бы не зрабіў нічога заганнага — проста знёс перагародку і пашырыў санвузел.

Бывае, жыхары ў панэльных дамах б'юць апорныя сцены, закладваюць там праёмы. Часцей за ўсё — паміж кухняй і пакоем. Але гэта апорная сцяна, на ёй яшчэ 8 паверхаў стаяць. Потым у верхніх кватэрах узнікаюць расколіны на сценах. Таму заўсёды трэба спачатку пракансультавацца са спецыялістам у мясцовым выканкаме, а не ў будаўнікоў, якія «дазваляюць» са словамі: «Гэта тонкая перагародка, можна». Так, яна ўсяго 120 мм, але гэта апорная сцяна.

Самавольная перапланіроўка часта прыводзіць да парушэння і планіровачных рашэнняў, і апорнай здольнасці сцяны. Потым, калі трэба ўсё гэта зацвярджаць (перапланіроўка заўсёды выяўляецца пры продажы кватэры, капрамонце, атрыманні кватэры ў спадчыну), даводзіцца плаціць штрафы. Акрамя таго, калі штосьці зроблена з парушэннем правілаў, трэба будзе гэтыя праблемы вырашаць: рабіць праект узмацнення апорнай канструкцыі, праходзіць дзяржаўную экспертызу, наймаць арганізацыю, якая выканае работы, наймаць праекціроўшчыкаў, якія б сачылі, як усё манціруецца, запрашаць тэхнагляд з ЖРЭА... Усё гэта, па-першае, вельмі доўга і клапотна, а па-другое, каштуе немалых грошай. Часам працэс расцягваецца на два гады! Мы пастаянна сутыкаемся з такімі сітуацыямі, бо часта не ўзгадняем падобныя праекты. Не раз даводзілася чуць: «Калі б я толькі ведаў, чым усё гэта абернецца! Калі б толькі хто-небудзь сказаў, што нельга рабіць гэты праём паміж пакоем і кухняй, я не рабіў бы нізашто!» Былі выпадкі, калі з-за самавольных перапланіровак рушыліся пад'езды.

У Маскве, дарэчы, цалкам узгадненне не адмяняецца, яно адбываецца, але ў спрошчанай форме. Акрамя таго, перапланіроўку ўсё роўна трэба ўзаконіць. У нас усё практычна тое ж самае. Той жа прынцып «адзінага акна». Адзінае — масквічы зараз дзякуючы апублікаваным варыянтам тыпавых перапланіровак могуць, не выходзячы з дома, даведацца, што можна рабіць, а што нельга. Нам жа трэба ісці ў выканкам.

Перапланіроўка кватэры: толькі па правілах!

Парадак перабудовы і перапланіроўкі жылых памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах рэгулюецца спецыяльным палажэннем, якое было зацверджана пастановай Савета Міністраў № 1805 ад 31.12.2006 г.

ПЕРАЎЛАДКАВАННЕ і перапланіроўка памяшканняў у шматкватэрных жылых дамах, у якіх не абрана форма кіравання (не створана Таварыства ўласнікаў, ЖБК, МЖК і г.д.), праводзяцца з дазволу мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. У дамах арганізацый забудоўшчыкаў дазвол трэба атрымліваць у органах кіравання гэтых арганізацый.

Пасля атрымання дазволу мясцовага выканкама вы складаеце дамову на распрацоўку праекта з праектнай арганізацыяй альбо праекціроўшчыкам, які мае спецыяльны дазвол (ліцэнзію). Праектная арганізацыя альбо праекціроўшчык распрацоўвае і ўзгадняе праект, а таксама пры неабходнасці забяспечвае ва ўстаноўленым парадку правядзенне дзяржаўнай пазаведамаснай экспертызы гэтага праекта.

Што рабіць забараняецца

Нельга праводзіць работы з парушэннем дзейных будаўнічых, супрацьпажарных, санітарна-гігіенічных і іншых патрабаванняў. Забаронена рабіць усё тое, што прыводзіць да зніжэння апорнай здольнасці канструкцый (асноў падмуркаў, калон, сцен, бэлек, перакрыццяў, апор, міжаконняў, канструкцый дахаў) а таксама гідра-, пара-, цепла- і гукаізаляцыі, бія- і вогнеўстойлівасці апорных і агароджвальных канструкцый. Тое ж самае, калі выкананне нейкіх работ цягне за сабой парушэнне рэжыму працы сістэм вентыляцыі, дыма- і газавыдалення, а таксама парушэнне і пагаршэнне параметраў працы інжынерна-тэхнічнага абсталявання дома ці асобных памяшканняў.

Забараняецца праводзіць падобныя работы ў жылых памяшканнях без натуральнага асвятлення, усталёўваць перагародкі, якія трапляюць у аконныя праёмы, а таксама — дадатковае абсталяванне цэнтральнага ацяплення, гарачага водазабеспячэння і электратэхнічнага абсталявання, калі гэта прывядзе да павелічэння гранічна дапушчальных разліковых інжынерных нагрузак на адно памяшканне жылога дома. Пад забаронай — працы па змене каляровага рашэння фасада жылога дома, а таксама перабудова і перапланіроўка памяшканняў, калі жылы дом ва ўстаноўленым парадку прызнаны непрыдатным для пражывання і не падлягае аднаўленню.

На што трэба дазвол выканкама і праектная дакументацыя

У гэтай катэгорыі работ — установка (дэмантаж) стацыянарнага інжынернага абсталявання; уладкаванне і замена сістэм водазабеспячэння, газазабеспячэння, ацяплення, электразабеспячэння, каналізацыі, смецевыдалення, газавыдалення, вентыляцыі; пераўладкаванне гідра-, пара-, цепла- і гукаізаляцыі; балконаў і лоджый; іншыя віды работ (па меркаванні мясцовага выканаўчага і распарадчага органа).

ДА ЎВАГІ: для правядзення работ па разборцы існуючых і ўладкаванні новых перагародак патрабуецца дазвол мясцовага выканаўчага і распарадчага органа, але распрацоўка праекта не патрабуецца.

Што можна рабіць без атрымання дазволу і праекта

Можна ўсталёўваць (змяняць) міжпакаёвыя дзверы ў межах дзвярнога праёму; уладкоўваць падвясныя (нацяжныя) столі; уладкоўваць і дэмантаваць стацыянарныя шафы і антрэсолі; усталёўваць вентыляцыйныя прыборы; мяняць электратэхнічныя вырабы (разеткі, выключальнікі, свяцільні) і падлогавыя пакрыцці, на тыя, што маюць аналагічныя тэхнічныя характарыстыкі; мяняць электрычныя пліты і санітарна-тэхнічнае абсталяванне. Гэтыя працы не з'яўляюцца пераўладкаваннем і перапланіроўкай жылога памяшкання.

* * *

У палажэнні таксама названы працы, на якія не трэба атрымліваць дазвол мясцовых улад і заказваць праект, але іх выкананне трэба ўзгадняць з пэўнымі арганізацыямі. Напрыклад, шкленне лоджый і балконаў (не блытаць з устаноўкай лоджый і балконаў) трэба ўзгадняць з раённым аддзелам архітэктуры. Усталёўка ўзмоцненых і дадатковых уваходных дзвярэй у памяшканні ўзгадняецца з ЖЭСам, таварыствам уласнікаў, ЖБК або МЖК — у залежнасці ад таго, у каго дом знаходзіцца на абслугоўванні.

Святлана БУСЬКО.

ДАРЭЧЫ

Згодна з палажэннем, у перыяд правядзення пераўладкавання і перапланіроўкі памяшкання ў выхадныя і святочныя дні забараняюцца работы, якія ствараюць шум або вібрацыю. У працоўныя дні такія работы нельга пачынаць раней за 9 гадзін і заканчваць іх пазней за 19 гадзін. Прымяняць пры правядзенні работ абсталяванне і інструменты, ад працы якіх узровень шуму і вібрацыі перавышае ўстаноўленыя санітарныя нормы, таксама забараняецца. Забаронена выкарыстоўваць пасажырскія ліфты для транспарціроўкі будаўнічых матэрыялаў і іх адходаў без пакавання.

«АМЕРЫКАНЕЦ» ПАТАННЕЎ, ЕЎРА І РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ ПАДАРАЖЭЛІ

Учора на адзінай сесіі Беларускай валютна-фондавай біржы долар патаннеў на 40 рублёў, а еўра і расійскі рубель падаражэлі: на 80 і 2 рублі адпаведна.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

КУРСЫ НЕКАТОРЫХ БАНКАЎ НА 28 КАСТРЫЧНІКА:

«Белінвестбанк»: долар ЗША — 8400 і 8700; еўра — 11600 і 12200; расійскі рубель — 270 і 285.

«БПС-Ашчадбанк»: долар ЗША — 8400 і 8700; еўра — 11800 і 12540; расійскі рубель — 276 і 296.

«Франсабанк»: долар ЗША — 8450 і 8590; еўра — 11950 і 12300; расійскі рубель — 280 і 289.

ПАДПАЛ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ КАШТОЎНАСЦІ

У чацвер у 22.51 у Мінскае гарадское ўпраўленне МНС па тэлефоне «101» звярнуўся мужчына і паведаміў пра пажар у жылым доме па вуліцы Рэвалюцыйнай, 28. Варта падкрэсліць, што згаданы дом — гісторыка-культурная каштоўнасць.

Агнём пашкоджана абшыўка на плошчы 15 квадратных метраў. Пацярпелых няма. Як мяркуецца, гэта быў падпал. Вінаватая асоба ўстанаўліваецца.

Сяргей РАСОЛЬКА.

18 НОЯБРЯ 2011 ГОДА СОСТОИТСЯ ПОВТОРНОЕ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «Лукомльэнергомонтаж»,

расположенного по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8.

Собрание пройдет по адресу: г. Новолукомль, Лукомльское шоссе, 8, актовый зал. Внеочередное общее собрание акционеров проводится в смешанной форме.

Повестка дня собрания:

1. Об уменьшении уставного фонда Общества.
2. О внесении изменений и дополнений в Устав Общества в соответствии с Законом Республики Беларусь от 15.07.2011 г. № 168-З и изложение его в новой редакции.

Время и место ознакомления акционеров с материалами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник—пятница), начиная с 03.11.2011 г., по месту нахождения Общества (приемная) с 13.00 до 16.00.

Время регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 08.00 до 09.45.

Время начала проведения собрания 10 часов 00 минут.

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию на 01.09.2011 г.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
- акционеру Общества — паспорт;
- представителю акционера — паспорт и доверенность.

УНП 300007839

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового полиса по добровольному страхованию ответственности и расходов перевозчика (согласно конвенции о договоре международной перевозки грузов 1956 г.) серии БВ № 0006727 считать недействительным. *УНП 101883943.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ

Открытое акционерное общество «Могилевский завод искусственного волокна» ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ НЕИСПОЛЬЗУЕМОГО ИМУЩЕСТВА

Аукцион состоится 1 декабря 2011 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Собственник, продавец и организатор аукциона:
ОАО «Могилевский завод искусственного волокна», г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.
Контактный телефон (8 0222) 29 75 13.

№ лота	Наименование	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб.	В т.ч. сумма НДС 20%, руб.	Сумма задатка с НДС, руб.
1	Бак для масла	1960	**5 000 000**	833 333	500 000
2	Бак для масла	1960	**5 000 000**	833 333	500 000
3	Бак для масла	1960	**5 000 000**	833 333	500 000
4	Бобинорезательная машина для продольного разрезания рулонов	2000	**40 000 000**	6 666 667	4 000 000
5	Трактор Т-150к	1988	**33 000 000**	5 500 000	3 300 000

Лот № 5 – Трактор Т-150к продается по методу понижения начальной цены. Минимальная цена продажи – 22 000 000 руб. с НДС.

Объекты расположены по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105.

Заявителю для участия в аукционе необходимо в срок, указанный в извещении, внести задаток, заключить соглашение о правах и обязанностях сторон, а также представить необходимый пакет документов в соответствии с действующим законодательством.

Задатки перечисляются не позднее **30 ноября 2011 года** на счет ОАО «Могилевский ЗИВ»: р/с 3012110491088 в Могилевском региональном отделении ОАО «Белвнешэкономбанк» код 226, УНН 790133562, ОКПО 291562437000.

Заявки принимаются ежедневно в рабочие дни с 9 до 17 часов по адресу: г. Могилев, ул. Челюскинцев, 105, ОАО «Могилевский ЗИВ», каб. 315.

Последний день подачи заявок: **30 ноября 2011 года** до 17.00. Заключительная регистрация участников аукциона состоится **1 декабря 2011 года** с 11.30 до 12.00 в зале заседания ОАО «Могилевский ЗИВ».

Всем желающим предоставляется возможность предварительного ознакомления с объектами аукциона.

Победителем признается участник, предложивший наибольшую цену.

Продавец имеет право снять предмет аукциона с торгов не позднее 3-х дней до его проведения, о чем извещаются участники.

Срок заключения договора – не позднее 15 рабочих дней с момента подписания сторонами протокола о результатах проведения торгов.

Задаток засчитывается в счет оплаты приобретенного объекта. Победитель аукциона в течение 5 рабочих дней, после проведения торгов, возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением документации, необходимой для его проведения. Демонтаж оборудования проводится за счет покупателя и в стоимость объектов не включается.

Минский городской центр недвижимости

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении 30 ноября 2011 года открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Витебскоблресурсы»

Предмет торгов (наименование и характеристики продаваемого имущества)	- незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-59777 (главный корпус) общей площадью 7471,2 кв.м; - незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-59778 (открытый склад крупногабаритных грузов) общей площадью 1170,7 кв.м; - незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-59781 (ремонтно-механические мастерские с зарядкой) общей площадью 418,8 кв.м; - незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-59782 (административно-бытовой корпус) общей площадью 1308,5 кв.м; - незавершенное законсервированное капитальное строение с инвентарным номером 200/U-59789 (контрольно-пропускной пункт) общей площадью 31,1 кв.м
Сведения о земельном участке	Площадь – 1,8344 га, кадастровый номер 240100000003000671, назначение – строительство и дальнейшее обслуживание производственной базы
Местонахождение продаваемого имущества	г. Витебск, Бешенковичское шоссе
Сведения о продавце	ОАО «Витебскоблресурсы», ул. 2-я Продольная, 3, 210605, Витебск, тел. (0212) 27 01 95
Сведения об организаторе аукциона	УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, тел. (017) 227 48 36
Начальная цена предмета торгов	2 827 755 600 белорусских рублей
Сумма задатка	200 000 000 белорусских рублей

Торги проводятся в соответствии с порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Витебскоблресурсы», утвержденным организатором аукциона.

К участию в аукционе допускаются юридические и физические лица, предоставившие организатору аукциона следующие документы:

заявление на участие в аукционе; заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона; заверенные копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах); заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется в течение 30 календарных дней с даты заключения договора купли-продажи.

Аукцион состоится **30 ноября 2011 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в аукционе осуществляются **с 31.10.2011 по 28.11.2011 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 17.00 (в пятницу – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок: (017) 227 48 36, (0212) 27 01 95.

Раковский сельский исполнительный комитет Воложинского района Минской области (Продавец)

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже 2 (двух) земельных участков для индивидуального жилищного строительства:

Лот № 1 — земельный участок в агрогородке Раков, переулок Северный, 19 площадью 0,1346 гектара, кадастровый номер участка 622085715604000028, начальная цена 3800 долларов США по курсу Нацбанка на день проведения аукциона. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Имеется газоснабжение;

Лот № 2 — земельный участок в деревне Бузуны, участок № 2 Б площадью 0,1500 гектара, кадастровый номер участка 622085702101000249, начальная цена 2300 долларов США по курсу Нацбанка на день проведения аукциона. Целевое назначение земельного участка — строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома. Удалённость от центра агрогородка Раков 4 километра, асфальтированный подъезд, готовится проект уличных сетей (электричество, дорога, водопровод).

Продажа земельных участков производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики или приравненным к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется квитанцией на расчетный счет госказначейства № 3600614140501 Главное управление МФ РБ по Минской области в ЦБУ № 605, г. Воложин, филиал № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк», МФО 153001601, УНП 600537220. Код платежа 04901.

Аукцион состоится **02 декабря 2011 года** (пятница) в 10.00 по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, 2-ой этаж, зал заседаний. Заявления на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 28 ноября 2011 года** (включительно) до 17.00 часов по адресу: а/г Раков, площадь Свободы, 11, кабинет управляющего делами исполкома.

Оплата по результатам аукциона должна быть произведена в десятидневный срок со дня подписания протокола.

Контактные телефоны: (8 01772) 52 2 36, 8 029 140 54 37.

Сведения о проданных на аукционах, конкурсах в 3 квартале 2011 года акциях, принадлежащих Республике Беларусь

№ п/п	Наименование открытого акционерного общества, место нахождения	Способ продажи	Количество проданных акций (% УФ)	Цена продажи, рублей	Покупатель	Условия конкурса
1.	Открытое акционерное общество «Слуцкая мебельная фабрика», 223610, Минская область, г. Слуцк, ул. Копыльская, 18	Аукцион	100 504 (54,3 %)	3 544 001 598	Частное унитарное производственное предприятие «Мебельная фабрика «Лагуна»	
2.	Открытое акционерное общество «Жлобинмебель», 247210, Гомельская обл., г. Жлобин, ул. Подъездная, 2	Аукцион	405 280 (88,3 %)	9 785 117 028	Частное унитарное производственное предприятие «Мебельная фабрика «Лагуна»	
3.	Открытое акционерное общество «Слониммебель», 231800, Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Торговая, 9	Аукцион	50 128 (32,7 %)	7 494 355 371	Общество с ограниченной ответственностью «Остамебель»	
4.	Открытое акционерное общество «Озтранс», 223021, Минская область, Минский район, Щомыслицкий сельский Совет, п/о Озерцо, Менковский тракт, 21	Конкурс	27035 (89,6 %)	4 530 000 000	Общество с дополнительной ответственностью «Евродизайн»	Внесение в уставный фонд ОАО «Озтранс» в виде вклада денежных средств, оборудования и материалов в сумме, эквивалентной 2,7 млн. долл. США, в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций с направлением указанных средств на развитие общества. При этом 1 млн. долл. США из указанных средств направить на строительство 3-этажного здания станции тех. обслуживания автомобилей с офисными помещениями в течение 2 лет с даты подписания договора купли-продажи акций; сохранение в течение 5 лет с даты подписания договора купли-продажи акций профиля деятельности общества и увеличение количества рабочих мест на 50 ед.
5.	Открытое акционерное общество «Элегант» 220000, Минская обл., г. Жодино, пр. Ленина, 22	Аукцион	39791 (46,0 %)	1 200 000 000	Общество с ограниченной ответственностью «УнивестСистем»	
6.	Открытое акционерное общество «Барановичигазстрой», 225409, Брестская обл., г. Барановичи, ул. С. Лазо, 4	Аукцион	37614 (80,7 %)	1 098 000 000	Частное инвестиционное унитарное предприятие «АнвойИнвест»	
7.	Открытое акционерное общество «Барановичская обувная фабрика», 225320, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Царюка, 5	Аукцион	182 (1,8 %)	35 950 053	Физическое лицо, Российская Федерация	
8.	Открытое акционерное общество «ПРОМСТРОЙСИСТЕМА», 220033, г. Минск, пр. Партизанский, дом 2, корп. 4, ком. 1513	Аукцион	27004 (75,4 %)	168 567 729	Общество с ограниченной ответственностью «Сож Строй»	
9.	Открытое акционерное общество «Борисовский ремонтно-механический завод», 222120, Минская обл., г. Борисов, ул. Строителей, 9	Аукцион	23036 (42,1 %)	2 800 000 000	Открытое акционерное общество «АТЭП-5»	
10.	Открытое акционерное общество «Лесохимик», 222120, Минская область, г. Борисов, ул. Демина, 3	Аукцион	9213 (15,4 %)	3 705 231 941	Открытое акционерное общество «Полесьежилстрой»	
11.	Открытое акционерное общество «Костюковичский леспромхоз», 213640, Могилевская обл., г.Костюковичи, ул. Бахарева, 11-а	Аукцион	1674 (5,0 %)	287 614 094	Открытое акционерное общество «Костюковичский леспромхоз»	
12.	Открытое акционерное общество «Рогачевгазстрой», 247673, Гомельская обл., Рогачевский р-н, г. Рогачев, ул. Кирова, 51а	Аукцион	353158 (86,7 %)	6 558 682 015	Общество с ограниченной ответственностью «Светлогорский завод сварочных электродов»	
13.	Открытое акционерное общество «Барановичская швейная фабрика», 225409, Брестская обл., г. Барановичи, ул. Войкова, 2	Конкурс	424072 (26,0 %)	3 202 000 000	Частное унитарное предприятие «Шарм Премьер»	Сохранение в течение 5 лет с даты заключения договора купли-продажи акций профиля деятельности ОАО «Барановичская швейная фабрика» и его специализации по производству детской одежды. Внесение в течение 2 лет с даты заключения договора купли-продажи акций в уставный фонд ОАО «Барановичская швейная фабрика» неденежного вклада в виде нового технологического оборудования на сумму, эквивалентную не менее 1 200 000 (одного миллиона двухсот тысяч) долларов США по курсу Национального банка на дату внесения этого оборудования.
14.	Открытое акционерное общество «Протон-М», 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. Фрунзе, 67	Аукцион	97 792 (100 %)	1 313 575 238	Общество с ограниченной ответственностью «ГРУЗАВТОМАРКЕТ»	
15.	Открытое акционерное общество «Полимер», 225630, Брестская обл., Лунинецкий р-н, д. Синкевичи, ул. Лесная, 2	Аукцион	462 340 (99,3 %)	2 037 372 599	Совместное белорусско-литовское предприятие «ТОРИМЭКС» общество с ограниченной ответственностью	
16.	Открытое акционерное общество «Житковичлес», 247960, Гомельская обл., г. Житковичи, ул. К. Маркса, 80	Аукцион	3 162 (13,4 %)	556 143 066	Общество с ограниченной ответственностью «УнивестСистем»	
17.	Открытое акционерное общество «СлуцкОблГарант», 223610, Минская обл., г. Слуцк, ул. Комсомольская, 5а	Аукцион	360 219 (99,8 %)	3 200 000 000	Общество с ограниченной ответственностью «Брокерс» (Латвийская Республика)	
18.	Открытое акционерное общество «Борисовский инструментальный завод», 222120, Минская область, г. Борисов, ул. Толстикова, 36	Аукцион	67734 (30,0 %)	299 145 000	Общество с ограниченной ответственностью «ЛИДЕРИНВЕСТ»	
19.	Открытое акционерное общество «Гомельский вычислительный центр строителей» 246044, г. Гомель, ул. Барыкина, 230	Аукцион	33293 (95,5 %)	320 000 000	Индивидуальный предприниматель, Республика Беларусь	
20.	Открытое акционерное общество «МОНТАЖСПЕЦКОМПЛЕКТ», 220073, г. Минск, ул. Бирюзова, 8	Аукцион	10191 (35,4 %)	1 060 500 000	Физическое лицо, Республика Беларусь	
21.	Открытое акционерное общество «Лошницкий завод «Агромаш», 222122, Минская область, Борисовский район, д. Лошница, ул. Рабочая, 1	Аукцион	583264 (99,8 %)	3 588 253 380	Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Велс-Аропроммаш»	
22.	Открытое акционерное общество «Молодечненский завод железобетонных изделий», 222310, Минская обл., г. Молодечно, ул. Элеваторная, 1	Аукцион	2233661 (99,9 %)	12 177 229 464	Общество с ограниченной ответственностью «Инженерный центр «АМТинжиниринг»	
23.	Открытое акционерное общество «Белпромкультура-Молодечно», 222310, Минская область, г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, дом 67, корпус 4	Аукцион	31934 (91,9 %)	850 000 000	Частное унитарное предприятие по оказанию услуг «Эдэн-Н»	

Будзьце прыкладам для сваіх дзяцей!

На многіх пешаходных пераходах у Віцебску на спецыяльных інфармацыйных стэндах, замацаваных пад святлафорамі, ёсць беларускамоўны напамін пра тое, што дарослым трэба быць прыкладам для дзяцей у сэнсе неабходнасці правільна пераходзіць дарогу. Дробязь, а прыемна.

Цікавых назіранняў па тэме карыстання беларускай мовай нямала. Хто пра што, «а лысы пра валасы» — гэта я пра любімую работу. Улічваючы, што працую ў беларускамоўнай газеце, перыядычна даводзіцца... «пакутаваць». Бо розныя адказныя асобы «не разумеюць» ці не хочуць разумець многае з тэкстаў, якія прыносіш ім «пачытаць» перад публікацыяй. Не буду канкрэтна называць установу, але ж, прабачце, калі нават у назве вашага ведамства ёсць слова «нацыянальны» і на той жа шыльдзе перад уваходам надпіс на беларускай мове, чаму ж тады на ўзроўні кіраўніцтва не зразумелі тэкст, які адправіў «на праўку»? Нагадаю, дарэчы, што цэнзура забаронена на законным узроўні. Але ж, зразумела, журналіст не можа фізічна за кароткі тэрмін унікнуць ва ўсе нюансы работы чарговага ведамства, таму і даводзіцца даваць тэксты «на вычытку». Далей — і смех і грэх. «У вас усё правільна напісана, толькі можна, каб тое ж самае было ў вашым тэксце на рускай мове?» — прыкладна так папрасіў мяне адказны чалавек, якому начальнік даручыла ўзгадніць яе ж каментарый. Во як! І лепш, на іх погляд, тэкст чытаўся б па-руску не толькі ў чарнавіку. Лепш і ў газеце.

«Людзі ў пагонах» таксама, відаць, служаць зусім не ў беларускай міліцыі. Папрасілі адзін артыкул зрабіць, каб паказаць добры досвед канкрэтнага раёна ў пытаннях прафілактыкі... бяды — можна і так сказаць. Што робіцца, каб не гарэлі людзі, пілі менш? Напісаў хутка. І таксама пачуў, што лепш бы было па-руску. Напэўна, дарэчы, памылкай у першыя гады суверэнітэту нашай краіны быў рэзкі пераклад матэрыялаў справаводства тых жа праваахоўных органаў на беларускую мову. Было такое, калі не памыляюся, у 1992 ці 1993 годзе. Бедныя маёры, капітаны і іншыя паважаныя афіцэры з галаўным болем і слоўнікамі побач спрабавалі аформіць нейкі чарговы пратакол і іншае. Можа, з тых часоў і не вельмі «паважаюць» мову? Хоць колькі ўжо гадоў прайшло, а новае пакаленне праваахоўных работнікаў, бадай, лепш англійскую ведае, чым родную мову. Хоць, заўважыў, сярод пракурорскіх работнікаў рознага ўзросту многія нават з інтарэсам чытаюць свой жа тэкст, перакладзены на беларускую мову.

Што тычыцца прадстаўнікоў улад. Магу шчыры камплімент зрабіць губернатару Віцебшчыны. Неаднаразова асабіста чуў падчас працяглых пасяджэнняў, як губернатар раптам, каментуючы нешта, пераходзіць на беларускую мову. А летась у Расонах, дзе праводзілі «Дажынкі», звяртаючыся да перадавікоў са сцэны, нават цытаваў на памяць твор беларускага класіка. Ці трэба падначаленым браць з яго прыклад?

Моўнае пытанне — рэч далікатная. Дадаў бы яшчэ, што інтымная. Тым больш, у нашай краіне, дзе няма ніякага канфлікту паміж прадстаўнікамі рускай, беларускай і іншых нацыянальнасцяў. Інтэлігентны, адукаваны чалавек сам зразумее, што без мовы яго продкаў ён, мякка кажучы, не зусім паўнацэнны. І для гэтага зусім не трэба атрымаць вышэйшую адукацыю, навуковую ступень і гэтак далей. Зусім нядаўна ў Оршы выпадкова меў гонар трохі паразмаўляць са звычайным рабочым, які працуе ва ўстанове пазашкольнай адукацыі. Дык ён чытаў мне вершы па-беларускай мове. Сказаў, што сам піша. Шкада, быў я тады з малымі дзецьмі і не было часу больш падрабязна пра ўсё яго распытаць. Ён — добры прыклад сваім дзецям і ўнукам. А мы... Сабе задайце пытанне.

Астраўком роднай мовы смела можна назваць «Беларускі тэатр «Лялька», білеты на спектаклі якога купіць цяжка. Рускамоўная дзятва з задавальненнем глядзіць беларускамоўныя спектаклі. Падчас розных конкурсаў і віктарын, няхай і нясмела, але ж размаўляюць з акцёрамі на роднай мове. А як было прыемна чуць чарнаскурую дзяўчынку, якая для сумеснага з рэдакцыяй «Звязды» конкурсу беларускамоўных паэтаў прыдумала верш. І высветлілася, што яна любіць беларускія казкі, вершы. Больш бы такіх. Ніколі не зразумею тых дарослых, якія не ходзяць на спектаклі нашага відзебскага тэатра імя Якуба Коласа. «Цяжка глядзець, калі па-беларуску размаўляюць», — такая іх «пазіцыя». Тым не менш і камедыі ў рэпертуары ёсць, і драмы. А прыедзе тэатр адкуль-небудзь з Расіі — натоўп ля кас. І няхай ён не «нацыянальны», не «акадэмічны», як наш імя Коласа. Затое па-руску. Што сказаць пра такіх «тэатралаў»? Спрачацца з імі — толькі час дарма траціць. Як і з тымі, хто не разумее мову родную. Жыццё не патрабуе гэтага?А душа?

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Чым можа скончыцца моўная абыякавасць?

У канцы мінулага года супрацоўнікі газеты «Звязда» паспрабавалі фактычна ацаніць рэальнае становішча беларускай мовы ў беларускай краіне. Да напісання матэрыялаў былі прыцягнуты самыя кампетэнтныя філолагі, лінгвісты, літаратары, грамадскія дзеячы. Праводзіліся гутаркі з вядомымі чыноўнікамі. Часам гутаркі былі ананімныя, некаторыя людзі, нягледзячы на афіцыйны статус, не пажадалі адкрыта прысутнічаць на старонках рэспубліканскай газеты.

У выніку было праведзена адпаведнае журналісцкае расследаванне, у якім былі прыведзены канкрэтныя факты, якія пасля выхаду публікацыі ніхто не ўзяўся аспрэчваць. Матэрыялы расследавання былі надрукаваны ў нумарах за 28, 29 і 30 снежня мінулага года і шырока разышліся па беларускім інтэрнэце.

Высновы расследавання аказаліся не самымі аптымістычнымі, калі выказвацца дыпламатычна. Але рэальнымі. Напрыклад, аказалася, што ў спажывецкай сферы нацыянальная мова амаль адсутнічае. Не, вы зможаце пачытаць беларускамоўнасці ўзнікаюць канфлікты і г.д.» Гэта сітуацыя ганебная і недапушчальная. Але пра тое, каб такіх настаўнікаў адправілі гандляваць мандарынамі, я не чуў. Відаць, ёсць свае заступнікі.

Безумоўна, пэўныя захады ў абарону мовы робяцца. Напрыклад, у некаторых гарадах чыноўнікі «блаславляюць» з'яўленне беларускамоўных рэкламных шчытоў уздоўж дарог. Раз на год праводзяцца «Дзень беларускага пісьменства», «Дзень роднай мовы», бясконца падпісваюцца разнастайныя «захады па ўкараненні беларускай мовы ў грамадстве» (хоць тыя з-за няграматнага падыходу часта не маюць эфекту). Яшчэ абяцаюць стварыць беларускамоўны канал. Хоць і так некаторыя тэлевядоўцы, якія спрабуюць размаўляць па-беларуску, гавораць, нібы дрын у рот паклаўшы. Атрымліваецца моўная дыскрэдытацыя, і нядзіўна, што гледачы падкрэсліваюць: «Калгаснік (калгасніца)». Таму што вядзеш праграму па-беларуску — размаўляй на роднай мове ў жыцці. Не можаш размаўляць — звярніся да лагапеда ці пачытай беларускую літаратуру, якая, дарэчы, высока ацэньваецца шмат дзе за мяжой.

У той жа час, калі я бяру інтэрв'ю ў найвыдатнейшых людзей Беларусі, тыя часта і нечакана цудоўна валодаюць мовай. Напрыклад, спартсмены. Трэнер адзінага беларускага медаліста на апошнім чэмпіянаце свету па боксе валодае мовай дасканала. У зборнай па муай-тай мовай на высокім узроўні валодае яшчэ адзін трэнер і некаторыя спартсмены. Пра іншыя віды спорту амаль не пішу, таму не ведаю. Але з тым жа сутыкаюся, калі бяру інтэрв'ю ў праграмістаў, юрыстаў, бізнэсоўцаў...

Аднак з-за недасканалага патрыятычнага выхавання і гэтыя людзі з часам расчароўваюцца ды з'язджаюць у Маскву, Кіеў, Германію, ЗША...

Я маю некалькіх беларускамоўных знаёмых у Нью-Ёрку, якія будуюць там шалёныя кар'еры... Там, а не дома. І ў многім гэта здараецца з-за няправільнага выхавання беларускай эліты, моўнай абыякавасці і маладушша «настаўнікаў». Бо здаровы патрыятызм — гэта той чыннік, які дапамагае ісці на ахвяры ў імя СВАЁЙ краіны і перажываць складаныя часы.

Але шанцаў у маладой беларускай эліты, на мой погляд, сёння няшмат. І яны — нярэдка ад'язджаюць. І гэтыя працэсы міграцыі, я лічу, у многім залежаць ад моўнай палітыкі.

* * *

На што неаднаразова звярталі ўвагу спецыялісты: наша грамадства падзелена на два лагеры — «нашы» і «не нашы». Беларускую мову зрабілі асноўнай прыкметай другога лагера. І хоць ты колам галаву прычэсвай, але размаўляеш па-беларуску — значыцца, «не наш»?

Што рабіць, каб вырашыць гэту глабальную праблему? Ці магчыма гэта і ці не позна? Я лічу, што магчыма. Захады, якія дакладна спрацуюць, выпрацаваны. Але абыякавасць, неразуменне праблемы і нежаданне яе вырашаць схіляюць да не вельмі аптымістычнага погляду на будучыню.

Яўген ВАЛОШЫН.

Фота Анатоля КЛЁШЧУКА.

Гэты фотаздымак зроблены, бадай, у самым сэрцы беларушчыны — на радзіме класіка нашай мовы і літаратуры Якуба Коласа. Калі дакладней — у 50 кроках ад Альбуці, з колішняга жыцця якой песняр стварыў сапраўдную энцыклапедыю сялянскага жыцця — паэму «Новая зямля». Відаць, нехта з наведнікаў музея, адчуўшы сорам, не вытрымаў і выправіў слова «берегите» на не менш прыгожае і, галоўнае, усім зразумелае і сваё родненькае — беражыце. Зразумела, плакат прыйдзецца мяняць. Цікава, што гэтым разам напішуць на ім стаўбцоўскія лесаводы — прадаўжальнікі справы палясоўшчыка Міхала Міцкевіча — бацькі Якуба Коласа?

РОДНАЯ МОВА — НЕ ПАПУЛЯРНАЯ. ПАКУЛЬ?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На канале «Магілёў» стала крыху больш рэкламы на роднай мове. Буйныя кампаніі даўно выкарыстоўваюць беларускую мову як дадатковы сродак прыцягнення ўвагі да рэкламы, але цяпер за імі пайшлі і мясцовыя вытворцы, і гандляры. Напрыклад, сетка магазінаў камп'ютарнай тэхнікі «Легіён» у Магілёве рэкламуе сябе па-беларуску.

І, вядома, цяпер уся Беларусь глядзіць рэкламу прадукцыі фабрыкі «Сонца» ў Асіповіцкім раёне. Пральны парашок «Мара» стаў лідарам продажаў у Беларусі. Безумоўна, тут паўплывалі крызіс і высокі кошт імпартных мыйных сродкаў. Але ўладальнікі фабрыкі лічаць, што спажыўцу, верагодна, прыйшлася даспадобы і рэклама на беларускай мове.

Магілёўшчына культурная

Нават з энтузіязмам гавораць пра пашырэнне ўжытку беларускай мовы ва ўстановах культуры Магілёўскай вобласці. Маўляў, міністр культуры Павел Латушка размаўляе на роднай мове — і за ім трэба цягнуцца, становішча абавязвае.

— У нас 90% мерапрыемстваў праходзяць па-беларуску, — запэўніў **начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Анатоль СІНКАВЕЦ**. — У снежні шыльды ўсіх устаноў культуры стануць беларускамоўнымі. Адкрываецца школа экскурсаводаў, якія будуць працаваць па-беларуску. А з новага года і мы ўсе пяройдзем на родную мову!

Што ж, ролю асобы ў папулярызацыі беларускай мовы ніхто не адмаўляе. Напрыклад, у справаздачы Магілёўскага гарвыканкама напісана: «Службовым асобам прапанавана выступаць у час урачыстасцяў, прысвечаных дзяржаўным і нацыянальным святам, значным грамадска-палітычным мерапрыемствам, на беларускай мове». Так, прапанавана, але хто гэта робіць? Канкрэтных прыкладаў прывесці не магу — напэўна, калі гэта адбываецца, то толькі зрэдку.

Праўда, гарадскія ідэолагі расказалі, што **старшыня Магілёўскага гарвыканкама Станіслаў БАРАДАЎКА** ведае беларускую мову, віншуе людзей праз гарадскую газету са святамі па-беларуску і нават звярнуўся да магілёўцаў у сувязі з Міжнародным днём роднай мовы. Дарэчы, менавіта гэты дзень шырока адзначаўся ў абласным цэнтры з дапамогай тэлерадыёкампаніі «Магілёў». У студыю прыйшлі школьнікі, якія чыталі свае любімыя вершы на беларускай мове. Потым гэтыя запісы гучалі ў гарадзе, на транспарце.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр РУДНІК падтрымаў у свой час распрацоўку мер па папулярызацыі беларускай мовы і заявіў, што кірунак на пашырэнне ўжытку роднай мовы — правільны, і мы па ім рухаемся.

Цікаўнасць да «ў»

Многія прыхільнікі беларускай мовы крытыкуюць улады Магілёва. Прэтэнзіі не канчаюцца, напрыклад, да тых жа шыльдаў. Вядома, для замены старых рускамоўных патрабуюцца выдаткі, але чаму б не зрабіць новыя на беларускай мове? Напрыклад, у новым палацы гімнастыкі?

Не менш пытанняў да сфер гандлю і паслуг. Чаму ўжыванне беларускай мовы ў крамах абмяжоўваецца слоганамі: «Купляйце беларускае» і «Зроблена ў Беларусі»? Чаму ў кавярнях і рэстаранах меню зроблена толькі па-руску? Выключэнне складае стылізаваная «Карчма на Шклоўскім базары»: там кліентам ніколі не замінае беларуская мова, нават наадварот — прыцягвае ўвагу.

Але ніякай беларускасці вы не знойдзеце на цэнтральных вуліцах Магілёва — Першамайскай і пешаходнай Ленінскай. А гэта якраз твар горада!

— Я шмат разоў назірала за паводзінамі турыстаў у Магілёве, у тым ліку расійскіх, — гаворыць **галоўны рэдактар прыватнага магілёўскага «2 канала» Алена БАРЫСАВА**. — Для іх нашы «ў» і «і» ў кірыліцы — гэта надта цікава. А мы іх нават не заўважаем!

На «2 канале» моўная палітыка не мяняецца 16 гадоў ад дня яго заснавання: гарадскія навіны і ўласныя праграмы выходзяць на беларускай мове, і ніводны глядач, сцвярджае Алена Барысава, ніколі не паскардзіўся, што не разумее ці не хоча чуць родную мову.

— Але ўвогуле сітуацыя такая, што да беларускай мовы нікому няма справы, — выказала сваё асабістае меркаванне магілёўская журналістка. — Можна было б зрабіць шмат чаго, але ніхто не хоча сябе абцяжарваць згадкамі пра тое, што бігборды і рэкламу можна аформіць на роднай мове. Проста абыякавасць!

Між тым, у Магілёве летась 1 верасня ў сярэдняй школе № 1 адкрыўся беларускамоўны клас. Як усе разумеюць, бацькі аддаюць сваіх дзяцей у яго толькі па жаданні. Сёння ў беларускім 2 «Г» класе вучацца 3 чалавекі.

Справа вяртання

Прарываць плаціну абыякавасці імкнуцца і грамадскія актывісты. Магілёўская гарадская арганізацыя Таварыства беларускай мовы пастаянна турбуе ўлады сваімі пытаннямі і ініцыятывамі. Новая сустрэча ў гарвыканкаме мяркуецца на пачатку лістапада.

— Мы звярнуліся з прапановай усталяваць у Магілёве помнік нацыянальнаму дзеячу, — гаворыць **старшыня гарадской арганізацыі ТБМ Алег ДЗЬЯЧКОЎ**. — Мяркуем, што было б дарэчы зрабіць помнік Янку Купалу — у сувязі з юбілеем аўтара паэмы «Магіла льва» — знакамітага паэтычнага падання аб паходжанні Магілёва.

Бліжэйшым часам ТБМ мяркуе правесці беларускамоўную вечарыну, прысвечаную Нілу Гілевічу, у сувязі з яго 80-годдзем. Дзейнічае кіно-клуб, дзе дэманструюцца вядомыя стужкі на роднай мове. Цяпер без перапынкаў працуе штотыднёвы гурток па вывучэнні беларускай мовы, які наведваюць самыя розныя людзі — ад старшакласнікаў да пенсіянераў.

— Сітуацыя з беларускай мовай за апошні час істотна не змянілася, — робіць выснову Алег Дзьячкоў. — Аднак падаецца, што працэсы ў грамадстве ўсё ж рухаюцца. Раней носьбітамі роднай мовы былі старыя людзі, а беларускамоўную моладзь мы, што называецца, усю ведалі ў твар. Цяпер шмат маладых людзей, якія імкнуцца вывучаць яе і карыстацца ёй. І гэта пазітыўна.

Напэўна, можна наракаць на ўлады ў справе беларускасці аспрэчваць тэзіс: у цяперашніх складаных эканамічных варунках падтрыманне роднай мовы не з'яўляецца першачарговай задачай. Але такая ж сітуацыя ўвогуле ў грамадстве: людзі ў большасці — асабліва гэта датычыцца памежнай з Расіяй Магілёўскай вобласці — размаўляюць на рускай мове, але праўда ў тым, што яны не супраць і мовы беларускай.

— Я не ведаю шмат людзей, якія б карысталіся ў жыцці і на працы беларускай мовай, — зазначае Ірына Акуловіч. — Аднак калі ўбачыла ў вітрыне магілёўскай крамы «Мілавіца» верш Максіма Багдановіча «Зорка Венера», які ўслаўляе прыгажосць беларускай жанчыны на роднай мове, мне было вельмі прыемна.

— Калі Магілёў вырашыў стаць культурнай сталіцай Беларусі і СНД у 2012 годзе, то варта было б пачаць якраз з роднай мовы, — лічыць Алена Барысава. — Гэта было б лагічна і нават проста, пагадзіцеся! Я, праўда, ужо не маю ілюзій наконт гэтай справы, але ўсё ж яшчэ мару пра вяртанне роднай мовы.

— Вельмі складана, але справа не стаіць на месцы, — запэўніла Жанна Дзмітрыева. — Мы спрабуем павярнуць грамадства да гэтай праблемы і будзем працаваць над папулярызацыяй беларускай мовы.

Ілона ІВАНОВА.

СПАТОЛЕННЕ МОЎНАЙ ПРАГІ

— Сядайце, калі ласка! — Прапанаваў нечакана па-беларуску ў тралейбусе мужчына, на выгляд — малады пенсіянер.

— Дзякуй! — выдала на аўтамаце.

Ён вельмі здзівіўся беларускамоўнаму адказу і пачаў вызначаць маю партыйную прыналежнасць. Бо, на яго погляд, на мове зараз гавораць толькі пэўным чынам палітычна абцяжараныя. Сваю біяграфію пераказаў у некалькіх сказах, з чаго стала зразумела, што мову вывучаў калісьці ў вясковай школе Мазырскага раёна:

— Вось толькі карыстацца ёю амаль не прыходзіцца, — пашкадаваў. Потым разышоўся і радасна выдаў некалькі баек з нацыянальным каларытам. Настрой на дзень быў забяспечаны некалькім дзясяткам пасажыраў гомельскага тралейбуса. Але ж мой позірк трапіў на таблічку з назвай маршрута, і рука сама пацягнулася за мабільнікам — каб сфатаграфаваць і падлічыць памылкі. Бо трэба «ГідрапрывАд» і «ГАНДЛЁВАГА», а не «таргов. абсталявання»...

«Превед, гоблин», або «Прывітанне, перакладчык!»

Мая сяброўка студэнцкіх гадоў у сваім калектыве газетчыкаў прапанавала тыдзень размаўляць выключна па-беларуску. Проста так, каб сябе праверыць. Гаворыць, калегі падтрымалі ініцыятыву з задавальненнем. Мне стала цікава: яны і па тэлефоне размаўляюць з незнаёмымі на роднай мове? Здаецца, далёка не ўсе размоўцы могуць вытрымаць такое выпрабаванне. Бо стэрэатып мыслення вядомы: з чаго гэта ён па-беларуску загаварыў? А мне як адказваць — таксама? І тут (калі размова ідзе пра здабычу нейкай інфармацыі) можа знікнуць самае галоўнае — шчырасць, давер. І растлумачвай потым доўга, што гэта быў толькі моўны эксперымент.

У сацыяльных сетках акаунты, статусы і перапіска маіх сяброў, калег і аднакласнікаў — толькі па-руску. Асобныя (у маім асяроддзі іх вельмі мала) маюць стасункі на той дзіўнай мове, якая амаль афіцыйна мае назву «падонкафф» ці «олбанский йазыгг». На іх фоне Таццяна — адзіная, хто імя, прозвішча, а таксама каментары піша па-беларуску. І дастаткова паслядоўна адстойвае сваё, замацаванае дыпломам аб філалагічнай адукацыі, права быць беларускай хоць бы ў віртуальнай прасторы. Лёгка пераходзіць на беларускую пры неабходнасці, аднак неабходнасць такая з'яўляецца насамрэч рэдка. А вось іншы знаёмы, быццам бы рускамоўны кліпмэйкер Андрэй прыемна здзівіў, калі на «сцяне» сайта павесіў спасылку пра тое, што ініцыятыўная група «GOMЕЛЬ!» Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта імя Сухога, якая за апошні год з'яўлялася ўдзельнікам і пераможцам розных мерапрыемстваў і конкурсаў, накіраваных на падтрымку іміджу горада, прапанавала ўстанавіць у абласным цэнтры рэкламныя шчыты «Беларуская мова ўнікальная».

Смачны водар мовы

Як вы разумееце, праігнараваць такую інфармацыйную падставу было проста нельга. Кіраўнік маладых людзей Ірына Чарняўская прыемным голасам на рускай мове расказала пра тое, што ініцыятары праекта прапанавалі ў сацыяльнай рэкламе выкарыстоўваць беларускую мову. Напрыклад, жыхарам горада над Сожам можна будзе адчуваць непаўторнасць роднай мовы, чытаючы пад малюнкамі на рэкламных шчытах назвы прадметаў, падпісаныя па-беларуску. Ну а спатканні хлопцы будуць дакладна прызначаць іх плаката, дзе камплімenты дзяўчыне дадзены ў двух варыянтах: па-руску і па-беларуску: *«Целомудренная — цнатлівая, трогательная — чуллівая, нежная — пяшчотная, совершенная — дасканалая, соблазнительная — спакуслівая...»* Так, хвілін 15 пастаіць, пачакае — лексічны запас павялічыць. А калі гадзіну давядзецца каханую чакаць, то можа, і мову вывучыць паступова. Удзельнікі ініцыятыўнай групы «GOMЕЛЬ!» лічаць, што ў абласным цэнтры неабходна развіваць сацыяльную рэкламу, якая будзе прыцягваць увагу да праблем грамадства, падштурхваць цікавасць да гісторыі і культуры краю. На гэтым аўтары праекта не спыняюцца і прапануюць знаёмства з нацыянальнымі стравамі, «смачным водарам беларускай мовы». Рэцэпт славутых дранікаў для тых, хто іх выпадкова не каштаваў.

На палескі густ

Тут самае галоўнае — і меру ведаць, і са спецыялістамі ў моўных пытаннях раіцца. Каб не атрымалася так, як у Хойніках. Да свята беларускага пісьменства ўнутры невялічкай мясцовай кулінарыі, якая знаходзіцца на цэнтральнай плошчы, павесілі вялізны плакат-пажаданне *«Прыемнага смаку»* на фоне «традыцыйнай беларускай» стравы — піцы. Дарэчы, для тых, хто не ведае. Пажаданне па-беларуску гучыць як *«Смачна есці»*, а тое, што напісана, на рускую можна перакласці, як: *«Приятного вкуса»*. Ну калі б гэта італьянцы ці кітайцы зычылі, можна было б даравать...

Псіхалогія супраць логікі?

Дарэчы, сёння дастаткова прыкладаў выкарыстання беларускай мовы ў рэкламе. Гавораць, маркетолагі адной сусветна вядомай аўтамабільнай фірмы пралічылі, што кампанія па прасоўванні іх нятаннага тавару ў нашай краіне будзе куды больш паспяховай, калі загучыць менавіта па-беларуску. Бо руская мова ўспрымаецца беларусамі як звычайная, побытавая, а беларуская — выключная, для тых, хто мае рацыю. І ўвагу пераборлівага спажыўца больш прыцягвае. Прынамсі, ёсць брэнды і слоганы, якія ўваходзяць у мозг на ўзроўні падсвядомасці. Да такіх суб'ектыўна аднесла б: «Прышпільны мабільны», «Шчасце, калі побач гаспадар», «Шпаркі дамавік», гандлёвая марка «Зала».

Спам па-беларуску

Ёсць і такі. Праўда, мне чамусьці доўгі час прыходзіў па-кітайску. Некаторыя спецыялісты растлумачваюць наяўнасць гэтага камп'ютарнага смецця з нацыянальным каларытам такім чынам. Маўляў, спамеры розных масцяў загаварылі на мовах малых народаў, што не можа не цешыць амаратараў лінгвістыкі. Гэта ўдалы рэкламны ход таму, што інфармацыя імітуе рэальнае паведамленне, і носьбіты мовы могуць успрыняць яго з захапленнем. Для прыкладу, такі шэдэўр з прэтэнзіяй на беларускасць, выцягнуты з сусветнага павуціння (стылістыка арыгінала захоўваецца): *«Ваш адрас электроннай пошты прыкладаецца да нумар квітка ў першы раздзел нашага прасоўвання па службе. Пераможцы былі абраныя камп'ютарызаванай сістэмы, складзены з кампаній і прыватных асоб адрасоў электроннай пошты па ўсім свеце. Малюе было афіцыйна абвешчана 22 жніўня, 2011.You Таму былі ўзнагароджаны ? 1.000.000.00 (Адзін мільён еўра), які з'яўляецца перамога плаціць за Катэгорыя пераможцаў... Калі ласка, звяжыцеся з Sponsorlotterij прэтэнзіі аддзела неадкладна з-за апрацоўкі і пералічэння грашовага прыза: Mr.Frank Генры...»*

Відаць, замежныя каты базіліа разлічваюць, што нам больш прыемна быць падманутымі па-беларуску.

Можа, на прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў такі падыход і будзе мець дзеянне, толькі не на беларусаў — яны словы не зразумеюць. Бо, згодна з тыпавымі вучэбнымі планамі ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання ў 2011-2012 навучальны годзе, падручнік беларускай мовы і літаратуры дзецям патрэбна браць у рукі раздва на тыдзень. І шкадуюць аб гэтым толькі настаўнікі, якіх пазбавілі «гадзін», і «асобныя зацікаўленыя»? Хаця, здаецца, каб вывучыць любую замежную мову, на што зараз робіцца акцэнт, трэба разумець родную.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. Фота аўтара, прадастаўленае ініцыятыўнай групай «GOMЕЛЬ!» і з інтэрнэту.

Минский районный исполнительный комитет *10 ноября 2011 г.* повторно проводит открытый *аукцион* по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

№ лота	Адрес земельного участка	Кадастровый номер	Площадь земельного участка	Целевое назначение	Расходы по подготовке документации (рублей)	Начальная цена земельного участка (рублей)	Задаток (рублей)
1	Боровлянский с/с, д. Королев Стан, участок № 117	623680604601000701	0,1642 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 952 590	124 000 000	12 400 000
2	Колодищанский с/с, п. Колодищи, ул. Путейская, квартал № 7, участок № 6	623683403101007191	0,1632 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	250 000 000	25 000 000
3	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 40	623683403601000179	0,1319 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	29 000 000	2 900 000
4	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 52	623683403601000180	0,1542 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	34 000 000	3 400 000
5	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 60	623683403601000182	0,1473 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	33 000 000	3 300 000
6	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 61	623683403601000183	0,1466 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	33 000 000	3 300 000
7	Колодищанский с/с, д. Липовая Колода, участок № 111 А	623683403601000184	0,1236 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 600 000	28 000 000	2 800 000
8	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 4	623684200601000033	0,1445 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	57 000 000	5 700 000
9	Михановичский с/с, д. Березина, участок № 13	623684200601000038	0,1536 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	61 000 000	6 100 000
10	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 1	623684202601000261	0,1404 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	61 000 000	6 100 000
11	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 2	623684202601000264	0,1400 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	61 000 000	6 100 000
12	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 4	623684202601000258	0,1392 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	61 000 000	6 100 000
13	Михановичский с/с, д. Кайково, ул. Животноводов, участок № 5	623684202601000259	0,1388 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 200 000	61 000 000	6 100 000
14	Михановичский с/с, д. Плебанцы	623684205601000121	0,2414 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	2 000 000	87 000 000	8 700 000
15	Остромицко-Городокский с/с, д. Новоселки, участок № 7	623685205101000263	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 558 356	47 000 000	4 700 000
16	Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 38	623685505101000338	0,1572 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 214 870	71 000 000	7 100 000
17	Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 39	623685505101000339	0,1608 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 214 870	73 000 000	7 300 000
18	Папернянский с/с, д. Цнянка	623685512101000039	0,1502 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 441 190	46 000 000	4 600 000
19	Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 61	623686600601000434	0,1464 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 286 980	51 000 000	5 100 000
20	Хатежинский с/с, д. Хатежино, участок № 262	623687508101001042	0,1501 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	84 000	43 000 000	4 300 000
21	Щомыслицкий с/с, д. Прилукская Слобода, участок № 215	623688006601000479	0,1500 га	Для строительства и обслуживания жилого дома	1 345 270	158 000 000	15 800 000

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **10.11.2011 г. в 9.45.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8:00 до 17:00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **03.11.2011 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лот 1 перечисляется на расчетный счет № 3641900000163 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052345, код платежа – 04901.

На Лоты 2–7 перечисляется на расчетный счет № 3641900000020 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052304, код платежа – 04901.

На Лоты 8–14 перечисляется на расчетный счет № 3641900000105 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600303747, код платежа – 04901.

На Лот 15 перечисляется на расчетный счет № 3641000000047 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600208279, код платежа – 04901.

На Лоты 16–18 перечисляется на расчетный счет № 3600621120145 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лот 19 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600062409, код платежа – 04901.

На Лот 20 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

На Лот 21 перечисляется на расчетный счет № 3600621180202 ГУ МФ РБ по Минской области, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052373, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона после трехкратного объявления первой объявленной цены не поднял аукционный номер; ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае местный исполнительный комитет в течение 10 рабочих дней после признания аукциона несостоявшимся принимает решение о предоставлении единственному участнику земельного участка в частную собственность. В течение 10 рабочих дней со дня принятия указанного решения гражданин обязан внести плату за земельный участок в размере его начальной цены, увеличенной на 5 %, возместить расходы, связанные с подготовкой аукциона и документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона).

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Заверенные банком копии платежных поручений о внесении задатка на расчетный счет.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельств

ПЯТНІЦА, 4 ЛІСТАПАДА

1 ПЕРШЫ

6.00, 7.05, 7.35, 8.10 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.45** Навіны.
7.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.35 Сфера інтарэсаў.
9.10, 19.55 Серыял «Лігаўка».
10.05 Серыял «Маргоша». Заключная серыя.
11.00, 17.55 Серыял «Апошні кардон».
12.10 Камедыя «Зладзейка».
14.00 «Зямля беларуская». «Чэрвеньская восень».
14.15 Клуб рэдактараў.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.35 М/ф.
16.05 Меладрама «Смяцяр».
19.30 «Зона Х».
21.00 Панарама.
21.45 Актуальнае інтэрв'ю.
22.00 Трылер «Час ведзьмаў».
23.55 Дзень спорту.
0.10 «Мая праўда». «Уладзімір Жырыноўскі».
10.35 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. «Атлетыка» — «Удзінезэ».
12.30 Кінапробы.
13.00 Час футбола.
13.45 Маст. фільм «Карона Расійскай імперыі, або Зноў няўлоўныя».
16.10 Жаночая ліга.
17.15 Урачэбныя тайны з доктарам А. Цярэшчанкам.
18.55 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Поўнач-сталь» (Чарапавец).
21.20 КЕНО.
21.25 Рэпарцёр «Беларускай часінкі».
22.15 Трагікамедыя «Вар'яцкая дапамога».
0.25 Канцэрт «Eurythmics. Peacetour».

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Аўтапанарама».
8.50 Маст. фільм «Акулы ў Малібу».
10.40 «Махляры».
11.40, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 «Агонь каханння». Серыял.
13.50 «Турысты». Серыял.
14.40 «Хірамант 2». Серыял.
15.35 «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
16.50 «Добры дзень, доктар».
18.30 Ток-шоу «Такі лёс».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.25 Камедыя «Блізнюк».
23.00 «Гарачы лёд».
23.30 «Расійскія покерныя турніры».
0.20 Маст. фільм «Адліга».
1.50 «Чаркізона. Аднаразовыя людзі». Серыял.

МІР

5.00 Маст. фільм «Цырк».
6.50, 2.45 Маст. фільм «Рускі сувенір».
9.00, 15.00, 18.00 Навіны Садружнасці.
9.10 Маст. фільм «Царскае паляванне».
11.20 Маст. фільм «Царэвіч Аляксей».
13.20 Маст. фільм «Беднымі, бедны Павел».
15.40 Маст. фільм «Князь ветру».
18.20 Серыял «Бадзяга».
21.50 Маст. фільм «Дэжавю».
23.55 «Неверагодная праўда пра зорак».
0.55 Маст. фільм «Д'ябальскае даміно».

8 КАНАЛ

7.00, 12.15, 14.05, 18.45, 21.00, 23.45 «Надвор'е».
7.05, 14.10 Серыял «Бліскучыя Азеракі».
8.50, 17.30 «Кінаблакнот».
9.10, 18.00 Серыял «Зачараваныя».
10.00 «Мой любімы гадаванец».
10.30 Серыял «Ментоўскія войны».
12.20 Камедыя «Ангар».
16.00 Мультпарад.
16.30 «Адшукваецца адпачынак».
17.00 «Музычны Апельсін».
18.50 Серыял «Версія».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Драма «Пах жанчыны».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 18.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.55 Серыял «Варонины».
10.00, 21.00 Серыял «Крамлёўскія курсанты».
11.00 Серыял «Я лячу».
12.00, 17.00 «Хачу верыць».
13.00 Серыял «Татавы дочкі».
14.00 Серыял «Будбацька».
15.00 Серыял «Ранеткі».
16.00 Серыял «Адчайныя хатнія гаспадыні».
19.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
22.10 «Відэабітва».
23.10 «Добрыя жарты».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА».
7.20 М/ф.
7.55 Трагікамедыя «Старэйшы сын».
10.20 Юбілей Кубанскага казацкага хору.
12.00 Меладрама «Жанчыны».
13.50, 17.45, 19.50, 22.55 Навіны — Беларусь.
14.00, 20.00 Весткі.
14.15 «Уся Расія».
14.30 Серыял «Даярка з Хацапетаўкі».
17.55 Драма «Афіцэры».
20.35 Юбілейны канцэрт Аляксандра Разенбаўма.
23.05 Маст. фільм «Кандагар».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.40 «Прафесія—рэпарцёр».
7.10 «Разбор палётаў».
8.00, 10.00, 13.00, 19.00 Сёння.
8.20 «І зноў прывітанне!».
9.20 «Увага: вышук!».
10.20 «Вочная стаўка».
11.15 «Да суда».
12.10, 13.10 «Суд прысяжных».
14.15 «Цэнтр дапамогі «Анастасія».
15.05, 19.30 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».
20.25 Маст. фільм «Смерш. Легенда для здрадніка».
0.00 Баявік «Снайпер».

ТНТ

5.00 М/с «Гэй, Арнольд!».
6.00 М/с «Жыццё і прыгоды робата-падлетка».
7.30 «Жаночая ліга».
9.00 «Непрыемнасці з малпачкай». Камедыя.
10.55 М/ф «Шалёны, шалёны, шалёны трус Бані».
12.20 М/ф «Стальны гігант».
14.00 М/с «Пінгвіны з «Мадагаскара».
14.30 «Універ. Новы інтэрнат».
22.00, 23.00, 1.55 «Дом-2».
23.30 «Сэкс» з Анфісай Чэхавай.
0.00 «Паўпрофі». Камедыя.
2.55 «Школа рамонту».
3.55 «Cosmopolitan». Відэаверсія».

ІНТЭР+

7.00, 8.00, 8.30, 9.00, 12.00 Навіны.
7.10, 7.35, 8.10, 8.35 З новай раніцай.
7.30, 20.30, 3.30 Спорт у «Падрабязнасцях».
9.10, 16.25, 5.00 Маст. фільм «Дзяўчынка з горада».
10.25, 18.25 Формула кахання. Вольга Волкава.
11.15, 20.35 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
12.15 Скептык.
12.45, 19.15, 2.15 Серыял «Сэрцу не загадаеш».
13.30 Сямейны суд.
14.15 Судовыя справы.
14.55, 22.45, 1.30 Купаж.
15.05, 1.45, 6.10 Дак. серыял «Найвялікшыя імёны 20-га стагоддзя».
15.30 Серыял «Паліцыя Гамбурга. Паўднёвая акруга».
17.35 Серыял «Выклік», «Прадказанне».
20.00, 3.00 «Падрабязнасці».
21.20, 3.35 Маст. фільм «Продлись, продлись, очаронанье».
23.00 Вялікая палітыка.
6.35 Краіна смяецца.

КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00 Героі Расіі. «Аляксандр Неўскі». Маст. фільм.
10.50 «Легенды сусветнага кіно».
11.20 XII Міжнародны конкурс юных музыкантаў «Шчаўкунок».
12.55 «Каменная кветка. Уральскі сказ». Маст. фільм.
14.15 Канцэрт, прысвечаны 75-годдзю Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля песні і танца данскіх казакоў імя Анатоля Квасава.
15.20, 0.55 «Нябачныя захавальнікі Крамля». Дак. фільм.
16.00 «Чалавек, які спявае з вышыні...». Дак. фільм.
16.40 «Рамантыка рамансаў».
17.35 «Тыя, з кім я... Аляксей Баталаў».
18.25 «Вялікая сям'я». Маст. фільм.
20.10 «Хрустальны Турандот». Бенефіс Марка Захарава.
21.25 Спектакль Марка Захарава «Блазан Балакіраў».
23.50 «Рыверданс». Канцэрт у Нью-Ёрку.
0.45 «Пра чмялёў і каралёў». М/ф для дарослых.
1.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

5.05 «Вясёлая моладзь». 1982 год.
6.15 «Новая рэальнасць». Дак. фільм. 1991 год.
6.40, 0.35 «Дванаццатая ноч». Спектакль. 1978 год.
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Бенефіс Тацяны Даронінай». 1980 год.
11.00 «У нас у двары». Дак. фільм. 1977 год.
12.00 Спявае Жанна Бічэўская. 1976 год.
12.40, 18.40 «Крадзеж». Маст. фільм.
16.00 «Тэатр + TV». 1992 год.
17.05 Сустрэча У. Познера з моладдзю СНД. 1992 год.
21.00 «Колба часу».
22.00 «Погляд». 1988 год.
23.00 «СевАлогія».
0.15 «Нядзельныя дзеці». Дак. фільм. 1989 год.

MTV

5.00, 1.50 Music.
6.00 Стэрэа_раніца.
8.30 «Губка Боб». М/ф
10.05 Тачку на пракачку.
10.30 Трэндзі.
11.00 MTV Special: Цімаці.
12.00, 17.00, 21.00, 22.50 «Канікулы ў Мексіцы».
13.00 Праверка чутак.
13.30 Зоркі на далоні.
14.00 Еўропа Плюс 2011.
18.00 Каханне з першага погляду.
19.00 «Подыум».
22.00 Сэкс у вялікім горадзе.
23.40 EMA: MTV's Best 2011.
0.00 Кэш&Трэш
0.30 World Stage.
1.20 Тэлепорт.

НАША КІНО

6.30, 12.30 Маст. фільм «Ферэнц Ліст. «Мроі кахання».
9.05 Драма «Апошняя цаля».
10.35, 16.30 Драма «Усё застаецца людзям».
15.05 Драма «Аліса і букініст».
18.30, 0.30 Меладрама «Выйсці замуж за капітана».
20.30, 2.30 Камедыя «Нябесныя ластаўкі».
22.40, 4.40 Камедыя «Начальнік Чукоткі».

2 ДОМ КІНО

3.00, 12.00, 19.10 Серыял «Таццянін дзень».
3.45 Серыял «Аперацыя «Гаргона». Заключная серыя.
4.35 Дэтэктыў «Міф пра ідэальнага мужчыну». Заключная серыя.
5.30 Дэтэктыў «Усяго адна ноч».
7.00 Драма «Цар».
8.55 Меладрама «Небяспечны ўзрост».
10.25 Золата «Масфільма». «Радня».
12.45 Серыял «ТАСС упаўнаважаны заявіць».
13.55 Камедыя «Паласаты рэйс».
15.20 Прыгоды «Набытак рэспублікі».
17.35 Камедыя «Май».
20.00 Драма «Брэсцкая крэпасць».
22.15 Камедыя «Кадрыля».
23.40 Фестывальнае кіно. «Васа».
1.50 Мюзікл «Шалёны дзень».

ДЗІЦЯЧЫ СВЕТ

5.00, 9.00, 13.00 Маст. фільм «Ашаламляльны Берандзеў».
6.05, 10.05, 14.05 М/с «Кацяня па імі Гаў». Зборнік м/ф. «Тайна жоўтага куста», «Алімпіёнікі», «Ненаглядны дапаможнік».
7.00, 11.00 М/с «Апошні з магікан». Казкі замежных пісьменнікаў. «Халіф-бусел». Казкі рускіх пісьменнікаў. «Сярэбраны капыток».
8.00, 12.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Дарожная казка», «Казка старога дуба», «Мой сябар Мартын».
15.00 Фільм-казка «Дамавік і каруначніца».
16.15 М/с «Кацяня па імені Гаў». Зборнік м/ф. «Поні бегае па крузе», «Клетка», «Вясёлая карусель № 10.
17.00 М/с «Апошні з магікан». Казкі замежных пісьменнікаў. «Каралеўскія зайцы». Казкі народаў свету. «Ад дажджу да дажджу».
18.00 «Урокі цётачкі Савы». Зборнік м/ф. «Нябесная гісторыя», «Дзве казкі».

ТЭЛЕКЛУБ

19.00, 1.00 Серыял «Багацце».
20.00, 2.00 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
21.00, 3.00 Серыял «Бандыцкі Пецярбург».
22.00, 23.30 Серыял «І зноў Аніскін».

ТБ3

5.00, 8.00, 4.45 М/ф.
5.30 Серыял «Трэцяя планета ад Сонца».
6.00 М/ф «Гарміці».
6.30 Дак. фільм «Дзецям пра звераняў».
7.00 Серыял «Зена — каралева воінаў».
8.45 Серыял «Мерлін».
10.30 Маст. фільм «Зялёны фургон».
13.15 Маст. фільм «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: знаёмства».
14.45 Маст. фільм «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан: крывавы надпіс».
16.00 Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса: кароль шантажу».
17.30 Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса: смяротная схватка».
18.30 Маст. фільм «Прыгоды Шэрлака Холмса: паляванне на тыгра».
20.00 «Дыскатэка 80-х».
23.00 Еўрапейскі покерны тур.
23.45 Маст. фільм «Ззянне».
1.45 Серыял «Застацца ў жывых».
2.45 Дак. фільм «Расшыфраваць твар».
3.45 Серыял «Прыцяжэнню насуперак».

ТБ-21

9.00, 17.00, 1.00 Камедыя «Пустата».
10.35, 18.35, 2.35 Баявік «Праца».
12.05, 20.05, 4.05 Драма «Дрывасек».
13.40, 21.40, 5.40 Драма «Адваротны эфект».

22.15 ФІЛЬМ ДНЯ

«ВАР'ЯЦКАЯ ДАПАМОГА» (РАСІЯ, 2009 Г.)

Дабрадушны Яўген прыязджае ў Маскву з беларускай вёскі і застаецца без грошай і дакументаў. Але бяздонага правінцыяла прытуліў незнаёмы масквіч, які... захапляе яго пафасам барацьбы з паўсядзённым злом сённяшняга мегаполіса.

Рэжысёр — Барыс Хлебнікаў. **У ролях:** Яўген Сыты, Сяргей Дрэйдэн, Ганна Міхалкова, Ігар Чарневіч.
15.10, 23.10, 7.10 Баявік «1408».

ТБ1000

3.00, 21.10 Трылер «Выкуп».
5.10 Трылер «Запаведная дарога».
7.00 Меладрама «Мільянер з трушчоб».
9.10 Камедыя «Забойствы на радыё».
11.10 Прыгоды «Мэверык».
13.30 Камедыя «Шосты элемент».
15.20 Камедыя «Дзядзечка Бак».
17.10 Драма «Іншы мужчына».
19.00 Меладрама «Спытай у пылу».
23.20 Камедыя «Гіганцік».
1.10 Прыгоды «Стары, які чытаў любоўныя раманы».

DIVA UNIVERSAL

5.00, 23.50 «Джордан расследуе».
6.30 Драма «Салодкі каваларчак».
7.50 Драма «Хлопец маёй дзяўчыны».
9.10 Драма «З школьных гадоў».
10.40 Маст. фільм «Прывітанне з узбярэжжа».
12.40 Маст. фільм «Правілы здымання: метад бабніка».
14.20 Маст. фільм. Прэм'ера. «Дабіся поспеху зноў!».
16.00 Маст. фільм «Мяне завуць Рыд Фіш».
17.40 Маст. фільм «Дабіся поспеху: усё за перамогу!».
19.10 «Сапраўдныя хатнія гаспадыні Нью-Ёрка».
20.00 Копы-навабранцы.
20.50 Бацькі.
21.40 Камедыя «Бляшаны кубак».
3.20 «Дочкі Маклеода».

РАМАНТЫКА

7.00, 21.20, 5.20 «Кругасветнае падарожжа».
7.55, 10.40, 20.30 «Доля-ліхадзейка».
8.50, 14.10, 16.55, 0.55 «Сальвадор — выратавальнік жанчын».
9.45, 15.05, 3.35 «Мая Папялушка».
11.30, 17.45, 2.40 «Паслухай, красуня».
12.25, 1.50, 6.10 «Плата не па заслугах».
13.20, 23.05, 4.30 «Парадоксы кахання».
16.00, 19.35, 22.10 «Дасканалая прыгажосць».
0.00 «Якія заблыталіся ў сеткі».

AXN-SciFi

0.35, 9.50, 19.15 Тайны Смалвіля.
1.30, 3.45 Чалавек-невідзімка.
2.10, 5.00, 13.00 Зорны шлях.
3.00, 5.45, 13.45, 17.45 На краі Сусвету.
4.30, 6.35, 14.35 Сшытак смерці.
7.00, 15.00, 21.40 Чорная лагуна.
8.25, 18.30, 23.50 Мёртвая зона.
9.05, 12.10, 23.05 Фактар страху.
10.40, 16.15 Чак.
20.00 Каўчэг.

EUROSPORT

9.30, 13.00, 17.00 Фігурнае катанне. Кубак Кітая.
10.45 Снукер. Players Tour Championship.
11.50, 19.20 Футбол. Клуб чэмпіёнаў.
12.00, 16.00, 1.15 Ралі. Серыя IRC.
18.50 Конны спорт. Скачкі.
19.30 Самыя дужыя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў.
21.30 Бокс. Bigger's Better.
23.45, 2.15 Вось гэта дзіва!!!
Першы намеснік начальніка дэпартамента палкоўнік Віктар Лебедзеў падзякаваў юным артыстам за выступленне, уручыўшы падарункі — мяккія цацкі і салодкія пачастункі. А ўсіх дам Віктар Мікалаевіч яшчэ раз павіншаваў са святам і пажадаў кахання, клопату і разумення з боку сваіх дзяцей: «Я хачу, каб ваша цесная сардэчная сувязь паміж дзецьмі і мамамі ніколі не страчвалася. Зычу вялізнага шчасця, моцдзясненнявыканання ўсіх жаданняў. Няхай усё, што вас акружае, будзе такім жа цудоўным, як вы самі».

У другой палове дня для ўсіх жанчын міністэрства ў канферэнц-зале Дзяржаўнага экспертна-крыміналістычнага цэнтра МУС быў арганізаваны канцэрт сіламі ансамбля Мінскага гарадскога ўпраўлення аховы «Любімы горад». Дзяўчаты спявалі настолькі пранікнёныя песні, што многія гледачы нават праслязіліся. Выступленне салісткі ансамбля Андрэя Хлястова ўразіла ўсіх не толькі сваёй шчырасцю і душэўнасцю, але і прымусіла некаторых адправіцца прама на сцэну, каб патанцаваць. У сваю чаргу, жаночае трыа «Любімага горада» не адставала, і для прысутных тат яны наладзілі невялікае выпрабаванне: тыя павінны былі танцаваць на сцэне разам з выступоўцамі. Спачатку мужчыны неахвотна ішлі на сцэну, бянтэжыліся і саромеліся, але, прызвычаіўшыся, настолькі разняволіліся, што з лёгкасцю самі выканалі куплет песні «Варажбітка», парадаваўшы цудоўную палову залы.

Пашыраем зону ўплыву

З якімі вынікамі Дэпартамент аховы падышоў да 59-й гадавіны з дня ўтварэння? На пытанні журналіста адказаў першы намеснік начальніка дэпартамента — начальнік управлення міліцэйскай, ваенізаванай і вартавой аховы палкоўнік міліцыі Віктар Лебедзеў.

— Віктар Мікалаевіч, вы на пасадзе 2 месяцы, тым не менш, гэты напрамак для вас не новы, паколькі некалькі гадоў вы кіравалі аддзелам міліцэйскай аховы ў складзе ўпраўлення. Сёння вы непасрэдна адказваеце за страявыя падраздзяленні міліцыі і ўвесь вартавы састаў. Чым дэпартамент можа пахваліцца ў свой дзень нараджэння?

— Нам не соромна інфармаваць грамадзян пра вынікі дзейнасці дэпартамента. У няпростых эканамічных умовах захаваўшы штатную колькасць асабовага складу, мы значна памножылі аб'ёмы паслуг, якія аказваюцца намі. Зрабіўшы стаўку не на павелічэнне колькасці супрацоўнікаў, а на якасную мадэрнізацыю службовай дзейнасці, выйгралі і мы, і грамадзяне краіны, на карысць якіх і працуем. Сёння дэпар-тамент забяспечвае бяспеку больш за 190,5 тысячы аб'ектаў усіх формаў уласнасці. У гэтую колькасць уваходзіць 152,5 тысячы кватэр і прыватных дамоў. З пачатку года мы прынялі пад сваю апеку каля 7000 памяшканняў з асабістай маёмасцю грамадзян. Натуральна, з лічбаў відаць, наколькі ўзрасла наша адказнасць. А прафесіяналізм нашых страявых падраздзяленняў пры рэагаванні на сігналы трывогі толькі расце. У асноўным мы працуем на прафілактыку. Не сакрэт, што ў кватэру або на аб'ект, тэхнічна звязаны з нашым падраздзяленнем, не вельмі і імкнуцца пранікнуць зламыснікі, якія ведаюць пра нашы магчымасці і якасць нясення службы. Тым не менш, гэтыя факты ёсць. За 9 месяцаў прадухілена 332 спробы парушэння цэласнасці аб'ектаў і кватэр, якія мы ахоўваем, пры гэтым раскрыта 50 злачынстваў, у 266 выпадках (80%) зламыснікі затрымліваліся непасрэдна на аб'ектах, якія ахоўваюцца. Летась у 71% выпадкаў затрымліваліся правапарушальнікі, якія ўчынілі пранікненне на нашы аб'екты. Так што мы сталі працаваць больш хутка, дакладна, вынікова. Прадбачачы ваша пытанне, адзначу, што з агульнай колькасці пранікненняў на аб'екты, якія ахоўваюцца, замаскіх на кватэры і іншыя памяшканні з асабістай маёмасцю грамадзян склалі 30 фактаў. Усё-такі светлавы індыкатар аховы з'яўляецца сур'ёзным стрымальным фактарам для злачынцаў.

Выконваючы абавязкі па ахове аб'ектаў і кватэр, на пастах і маршрутах патрулявання, нашымі нарадамі спынена 4210 злачынстваў, сярод якіх 23 забойствы, 98 цяжкіх цялесных пашкоджанняў, 24 разбоі, 347 грабяжоў, 1852 крадзяжы, 393 хуліганствы.

— З пункту гледжання афіцэра аховы з вялікім вопытам працы, ахарактарызуйце дынаміку развіцця дэпартамента ў апошнія гады. Ці развіваецца служба аховы ў нагу з часам?

— За час існавання служба аховы пастаянна развівалася. Менавіта планамерны, паступальны рух наперад зрабіў яе надзейнай, праверанай, сучаснай. Прычым мы не толькі ўкараняем уласныя інавацыі, але і вывучаем попыт іншых краін блізкага і далёкага замежжа, абменьваемся распрацоўкамі, ажыццяўляем сумесныя праекты. Адзін з самых значных — гэта так званы «калідор бяспекі» на аўтадарозе Брэст — Масква. Выконваючы рашэнне аб'яднанай калегіі Міністэрства ўнутраных спраў Саюзнай дзяржавы, мы з расійскімі калегамі паступова стваралі гэтую складаную, але такую неабходную сістэму бяспекі аўтатранспарту і грузаў, якія перавозяцца, пабудаваную на выкарыстанні высокіх тэхналогій. Вучэнні, якія мы праводзілі і на нашай тэрыторыі, і на расійскай, паказалі, што праект атрымаўся якасным і практычна гатовы да ўвядзення ў дзеянне.

Мы пастаянна мадэрнізуем камп'ютарную сістэму перадачы паведамленняў аб пранікненнях і пажарах «Алеся», якая з'яўляецца аснавай нашага назірання за ахоўнымі аб'ектамі. Сёння «Алеся», акрамя тэлефонных ліній, працуе і па каналах GSM-сувязі з выкарыстаннем паслугі GPRS.

Мы стварылі адзіны інфармацыйны інтэрнэт-партал Дэпартамента аховы, у мэтах пашырэння інфармавання насельніцтва і суб'ектаў гаспадарання пра ўсе спектры ахоўных паслуг, якія мы аказваем, прававыя асновы ліцэнзійнай дзейнасці і перспектывы развіцця падраздзяленняў аховы.

— Якія яшчэ інавацыі былі ўкаранёны ў падраздзяленнях аховы?

— Адной з глабальных навінак магу назваць навігацыйна-маніторынгавую сістэму кантролю і кіравання нарадамі, якая пастаўлена на ўзбраенне аператыўна-дзяжурных службаў падраздзяленняў аховы. Яе прызначэнне — праз спадарожнікавую сістэму GPS кіраваць нарадамі, якія нясуць службу на аўтамабілях, а таксама ў рэжыме рэальнага часу кантраляваць і візуальна назіраць усе транспартныя сродкі з адзінага цэнтра.

Неабходнасць прымянення сістэмы маніторынгу ўзнікла і рэалізавана перш за ўсё ў буйных падраздзяленнях, якія маюць у дыслакацыі тры і больш экіпажы, калі інспектару-дзяжурнаму неабходна ў найкарацейшы тэрмін прыбыць на месца злачынства або здарэння. Навігацыйнымі тэрміналамі аснашчаны ўсе аўтамашыны ў сталіцы, абласных цэнтрах, буйных гарадах, а ў дзяжурных часцях гэтых рэгіёнаў разгорнуты апаратна-праграмныя сродкі. Што датычыцца дзяжурнай часці самога дэпартамента, то мы бачым нашы экіпажы па ўсёй рэспубліцы.

— Чаго чакаць грамадзянам краіны ў бліжэйшы час ад Дэпартамента аховы? Ці будуць прапаноўвацца новыя паслугі, калі так, то якія?

— Над новымі паслугамі мы працуем пастаянна, але не будзем загадваць наперад. Як толькі будзе гатова чарговая прапанова, мы яе адразу ж агучым. Сёння мы пашыраем зону нашага ўплыву. Прынята рашэнне аб вынасе зон рэагавання нарадаў груп затрымання некаторых падраздзяленняў Мінска за межы кальцавой дарогі. Гэта дазволіць пашырыць геаграфію нашага абслугоўвання і забяспечваць паўнавартаснае аказанне паслуг у катэджных пасёлках і дачных масівах, ад жыльцоў якіх паступала найбольшая колькасць зваротаў.

САМАЯ СПАРТЫЎНАЯ СЯМ'Я

Дружная сям'я прапаршчыка Дзмітрыя Сівава — самая спартыўная ў Кастрычніцкім (г. Магілёва) аддзеле аховы. З жонкай Таццянай яны разам ужо 15 гадоў і выхоўваюць траіх дзяцей — дзяўчынак Яну і Дар'ю і сына Івана. І ніводнае сямейна-спартыўнае мерапрыемства не абыходзіцца без іх.

Сужэнцы Сівавы з'яўляюцца ўзорам для сваіх дзяцей. Цёплыя ўзаемаадносіны бацькі і маці ствараюць утульную атмасферу для ўсёй сям'і. Сужэнцы лічаць, што пераадоленне некаторых цяжкасцяў сёння вернецца ім пазней, а дзеці стануць іх надзейнай апорай. Бацькі ніколі не сумуюць і жывуць па прынцыпе: на харчаванне і адукацыю для сваіх дзяцей заўсёды можна зарабіць сумленным шляхам, калі ёсць жаданне.

Дзмітрый прыйшоў у міліцыю 11 гадоў таму. Ён — міліцыянер Кастрычніцкага (Магілёва) аддзела Дэпартамента аховы. Свабодны час цалкам аддае выхаванню дзяцей. Прыходзячы пасля дзяжурства, займаецца з імі не толькі ўрокамі, але і прыцягвае да фізічнай культуры і спорту. Дзмітрый Сіваў — майстар спорту па лёгкай атлетыцы, неаднаразовы пераможца чэмпіянатаў МУС Рэспублікі Беларусь, спартыўнага таварыства «Дынама», чэмпіён Еўропы на спаборніцтвах сярод паліцэйскіх.

Таццяна бачыць сваё асноўнае прызначэнне ў мацярынстве. І чым больш цеплыні і ласкі яна падарыла сваім дзецям, тым багацей прырода адорвае яе жаноцкасцю і мяккасцю.

У гэтай сям'і ўмеюць і саступіць, і адстаяць свой пункт гледжання. Такія ўзаемаадносіны выхоўваюць у дзецях пачуццё адказнасці, самастойнасці. А сумесныя справы згуртоўваюць сям'ю. Ёсць у іх «кулінарная» традыцыя — у 10 рук ляпіць пельмені. А яшчэ адзін паважаны ўсімі занятак — гэта спорт.

Галава сям'і шчыра адзываецца пра жонку так: «Самаадданая, ніколі не скардзіцца на жыццёвыя цяжкасці, раніцай устае раней за ўсіх, каб прыгатаваць сняданак на вялікую сям'ю, кладзецца пазней за ўсіх — пасля таго, як пажадае добрай ночы кожнаму дзіцяці». А сама Таццяна называе сябе проста мамай і жонкай.

Дзве даты

29 кастрычніка

1523 год — у Кракаве ў друкарні І. Віетора на лацінскай мове выйшаў зборнік беларускага паэта-гуманіста і асветніка эпохі Адраджэння Міколы Гусоўскага «Песня пра зубра». Паэтычны зборнік складаўся з празаічнага прысвячэння каралеве Боне Сфорца, аднайменнай паэмы і 11 вершаў.

1918 год — на I Усерасійскім з'ездзе саюзаў рабочай і сялянскай моладзі было прынята рашэнне аб аб'яднанні асобных разрозненых саюзаў у агульнарасійскую арганізацыю з адзіным цэнтрам, якая працуе пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі бальшавікоў. Так быў створаны Расійскі камуністычны саюз моладзі — РКСМ. У 1924 годзе пасля смерці Леніна ён атрымаў імя правадыра — ЛКСМ, а крыху пазней быў перайменаваны ў ВЛКСМ. За 73 гады праз шэрагі камсамола прайшло больш за 160 мільёнаў чалавек. Рашэнне аб самароспуску Усесаюзнага Ленінскага Камуністычнага Саюза Моладзі было прынята 27-28 верасня 1991 года на XXII надзвычайным з'ездзе ВЛКСМ.

Цытата дня:

«Мара — вельмі добрая і карысная рэч, калі не забываць, што яна ўсяго толькі — мара».

Жазеф Эрнест Рэнан (1823—1892), французскі пісьменнік.

Паважаная **Любоў Васільеўна Кулагіна,** мая шчырая зямлячка з Гомельшчыны, а зараз шаноўная суседка са Слуцка, мой былы нязменны старшыня бацькоўскага класнага камітэта, абаяльная, прыгожая, тактоўная жанчына!

У дзень юбілею зычу вам дабра і дабрыні, здароўя. Жадаю выдатнай працы ў аптэкарскай справе. Заставайцеся такой тактоўнай, добразычлівай і ўважлівай, якой я вас ведаю.

Удзячная случанка Новік Т.І.

Матэрыялы спецвыпуску падрыхтавалі:
У. ЗДАНОВІЧ, А. ГЕРАСІМАЎ, А. ЯРМАЛІНСКАЯ, В. КІПЧАНКА, А. ДАНІЛЬЧАНКА, А. НОВІК, А. САЛЯНЮК, В. ЛЕВАНКОВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА
по продаже объектов республиканской собственности и права заключения договоров аренды земельных участков для обслуживания недвижимого имущества

Лот № 1. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальное строение, инв. № 422/С-1199, расположенное по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Раковичский с/с, д. Раковичи, ул. Щучинская, д. 23, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425886003604000004 площадью 0,0696 га сроком на 30 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 16 339 057 руб., сумма задатка – 1 633 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: одноэтажное сборно-щитовое здание отделения связи с верандой, 1962 г. п. общ. пл. 59,6 кв. м	
Условия использования земельного участка: возможное использование здания под объект торгово-бытового назначения; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, при изменении цели предоставления земельного участка; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией; **ограничения по использованию:** водоохранная зона водных объектов	
Лот № 2. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальное строение, инв. № 422/С-1200, расположенное по адресу: Гродненская обл., Щучинский р-н, Остринский поссовет, д. Щенец, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 425876615610000003 площадью 0,0222 га сроком на 30 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 15 654 373 руб., сумма задатка – 1 565 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: одноэтажное бревенчатое здание отделения связи с дощатой террасой, 1967 г. п. общ. пл. 52,3 кв. м	
Условия использования земельного участка: возможное использование здания под объект торгово-бытового назначения; осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, при изменении цели предоставления земельного участка; осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Лот № 3. Предмет аукциона, место нахождения имущества, информация о земельном участке	**Капитальное строение, инв. № 431/С-642, расположенное по адресу: Гродненская обл., Кореличский р-н, Мирский поссовет, д. Любно, и право заключения договора аренды земельного участка с кадастровым номером 423375704601000005 площадью 0,0871 га сроком на 50 лет**
Начальная цена предмета аукциона – 50 129 989 руб., сумма задатка – 5 012 000 руб.	
Сведения об объектах недвижимости: одноэтажное кирпичное здание отделения связи, дощатый сарай, 1979 г. п. общ. пл. 88,7 кв. м	
Условия использования земельного участка: осуществление в двухмесячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении земельного участка, государственной регистрации права на земельный участок; получение в установленном порядке разрешения райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ и разработка строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий двух лет, осуществление строительства объекта в сроки, определенные проектно-сметной документацией	
Продавец недвижимого имущества по лотам 1, 2, 3: Республиканское унитарное предприятие почтовой связи «Белпочта», контактные телефоны: (8 0152) 74 61 47, 74 53 22	
Организатор аукциона: Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества (фонд «Гроднооблимущество»), 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39 (время работы с 8.30 до 13.00 и с 14.00 до 17.30, кроме выходных и праздничных дней), тел.: (8 0152) 74 53 86, 72 15 29, 74 53 82; **www.region.grodno.by, gki.gov.by**	

1. Аукцион состоится **1 декабря 2011 года в 10.30** по адресу: 230023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39.

2. Аукцион является открытым, его участниками могут быть граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы.

3. Заявления на участие в аукционе принимаются Организатором аукциона **по 25 ноября 2011 года до 16.00** по адресу: г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39, кабинет 6.

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет Организатора аукциона – фонда «Гроднооблимущество» № 3642900000187, МФО 152101752 в филиале 400 Гродненского областного управления ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, УНП 500044549;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия. Представителям юридических лиц просьба иметь при себе учредительные документы.

Консолидированными участниками дополнительно прилагаются: оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе; сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя и печатью; уполномоченным лицом (его представителем) – доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе.

4. Желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектами продажи.

5. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения; имеет право снять предмет аукциона с аукциона в любое время до объявления его проданным.

6. Не допускается начало торгов и продажа предмета аукциона по начальной цене. После объявления очередной цены аукционист называет номер участника аукциона, который первым поднял аукционный номер, и указывает на него, а затем в соответствии с шагом аукциона объявляет новую цену. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднимет только один участник. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет предмет аукциона проданным, а участника аукциона – победителем аукциона по соответствующему предмету аукциона.

7. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику (далее – претендент на покупку) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

8. Решение о предоставлении победителю аукциона (претенденту на покупку) земельного участка принимается местным исполнительным комитетом в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

9. Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан в течение 10 рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении земельного участка внести плату за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, расходы, связанные с формированием земельных участков и изменением земельных участков в результате такого формирования, государственной регистрацией в отношении этих участков.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке, в соответствии с условиями аукциона, Продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а местным исполнительным комитетом – договор аренды земельного участка.

10. Оплата стоимости приобретенного объекта республиканской собственности осуществляется в установленном законодательством порядке: победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся резидентом Республики Беларусь, – в рублях; победителем аукциона (претендентом на покупку), являющимся нерезидентом Республики Беларусь, – в рублях либо в иностранной валюте по курсу Национального банка на дату платежа. Срок оплаты недвижимого имущества – в течение 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Барыс БАРЫНГОЛЬЦ:

«Я 38 гадоў адпрацаваў у дзяржорганах, але не ўяўляў, што можна простае пытанне вырашаць тры месяцы, а то і паўгода»

Калі мы бачым пабудаваны бізнэс-цэнтр, новую краму ці кавярню, то думаем: вось малайчына бізнэсмен, такі аб'ект пабудаваў! Але мы бачым толькі вонкавы бок гэтага працэсу — абгарадзілі кавалак зямлі, прыехала тэхніка, і за пэўны час паўстаў новы будынак. А з якімі цяжкасцямі сутыкаецца бізнэс на ўсіх этапах рэалізацыі інвестпраектаў — мы не ведаем. Якраз пра гэтыя цяжкасці і перашкоды і пагаварылі прадстаўнікі айчыннага бізнэсу на Рэспубліканскім клубе дырэктараў, які праводзіў Бізнэс саюз прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя М.С. Куняўскага на базе «АўтаМола «Кальцо» ў Малінаўцы.

Юрый АВЯР'ЯНАЎ, вядомы беларускі прадпрымальнік, які з 1987 года пачаў весці свой бізнэс, быў на гэтым пасяджэнні ў якасці гаспадара: менавіта яму належыць ЗАТ «Гандлёвы свет «Кальцо», а таксама яшчэ шэраг аб'ектаў у сталіцы — будаўнічы рынак ва Уруччы, забаўляльны комплекс Dream Land, некалькі рэстаранаў і дыскатэк. Ён адзначыў, што пры рэалізацыі любога праекта ёсць цяжкасці, але ён не можа вылучыць з іх найбольш важкія:

— Дастаткова вялікая колькасць прадпрымальнікаў і кіраўнікоў дзяржаўных прадпрыемстваў спасылаюцца на цяжкасці. За столькі гадоў я ўжо да іх прывык, і нават цяжка сказаць, што найбольш складана: падпісаць паперу ці знайсці грошы, прыцягнуць інвестара ці прыдумаць арыгінальны праект, — кажа Юрый Авяр'янаў.

А вось **Барыс БАРЫНГОЛЬЦ, гендырэктар ЗАТ «Гандлёвы свет «Кальцо»,** лічыць, што бізнэсмены пры рэалізацыі нейкіх праектаў вельмі шмат часу марнуюць пры ўзгадненні гэтых праектаў у дзяржорганах:

— Мы сапраўды губляем вельмі шмат часу на разнастайныя ўзгадненні. Я 38 гадоў адпрацаваў у дзяржорганах, але не ўяўляў, што можна простае пытанне вырашаць тры месяцы, а то і паўгода. Для нас гэта вельмі шмат. Напрыклад, мы зямлю пад будаўнічы рынак узгаднялі паўгода. А за гэты час мы маглі палову першай чаргі пабудаваць.

Барыс Сямёнавіч пры гэтым адзначыў, што ў асноўным праекты тармазіліся ў камітэце архітэктуры Мінгарвыканкама, але зараз, пасля нядаўняга ўмяшання Прэзідэнта, справы там пайшлі хутчэй. Праўда, Барыс Барынгольц перажывае, ці надоўга хопіць гэтага паляпшэння.

Да таго ж, дзеліцца вопытам Юрый Авяр'янаў, часта чыноўнікі не разумеюць, чаму бізнэсмен прыйшоў менавіта з такім праектам:

— У камітэце архітэктуры чыноўнікі да канца не разумеюць камерцыйную мэтазгоднасць аб'екта. Ім трэба даказваць, што аб'ект павінен быць размешчаны менавіта так, быць менавіта такой павярховасці, такой плошчы, такой кампаноўкі. А ў камітэце кажуць: «Не, ён павінен быць такі і вось такі!». Але я ведаю, што калі я пабудую так, як яны прапануюць, то гэты праект не акупіцца. Я ж бізнэсмен, у мяне праекты павінны быць акупныя. А яны не ўнікаюць і не разумеюць гэтага. Вось гэта самая галоўная праблема. І таму даводзіцца як мінімум год даказваць, што менавіта наш праект аптымальна пралічаны і прадуманы, што ён будзе запатрабаваны.

Самыя смачныя кавалкі дастаюцца замежнаму бізнэсу?

Прадпрымальнік Юрый Авяр'янаў таксама расказаў, што яму гадоў пяць таму навязалі калгас у Вілейскім раёне:

— У мяне таксама ёсць аграфірма. Я, шчыра кажучы, год супраціўляўся, але ўсё адно нам навязалі гэты калгас у Вілейскім раёне. За 6 гадоў мы інвеставалі туды каля 6 мільёнаў долараў, і гэтая гаспадарка сёння знаходзіцца недзе ў першай дзясятцы раёна. Гэта адзіная гаспадарка, скажу шчыра, якая працуе без прыпісак. Бо я сказаў, што не магу скажаць бухгалтэрыю, мне як бізнэсмену неабходная лепей горкая праўда, чым салодкая мана.

І пакалькі ў Юрыя Авяр'янава з'явіўся сельскагаспадарчы бізнэс у Вілейскім раёне, то ён вырашыў пайсці далей. Праўда, мясцовыя ўлады яго чамусьці не падтрымалі:

— Я прапанаваў пабудаваць на Вілейскім вадасховішчы сур'ёзны кемпінг па амерыканскім варыянце: як мінімум 100 тысяч чалавек штогод маглі б прымаць на беразе Вілейскага вадасховішча. Быў бізнэс-план, вельмі арыгінальны праект, і ўвесь наш калгас працаваў бы на гэты кемпінг. Да таго ж, на тэрыторыі калгаса пражывае 4 тысячы жыхароў, а толькі 120 працуе ў калгасе. А з будаўніцтвам кемпінгу яшчэ як мінімум 200 працоўных месцаў было б створана. Але я атрымаў выразны адказ: «Займайся сельская гаспадаркай, не час сёння будаваць кемпінг».

Так праект і не ўдалося ажыццявіць — сёння ўжо кан'юнктура рынку не тая, шкадуе Юрый Авяр'янаў, хоць у Беларусі мог бы з'явіцца яшчэ адзін аб'ект для адпачынку беларускіх і замежных турыстаў.

Пра сельскую гаспадарку гаварыў і **Віктар ХІНЕВІЧ, генеральны дырэктар ЗАТ «Барысаўдзіцспецпрадукт»,** а лепей сказаць, што ён абураўся: чаму беларускі бізнэс прымушаюць займацца сельскай гаспадаркай, а замежным фірмам аддаюць лепшыя кавалкі ў прыбытковых сферах?

— Паглядзіце, як выкарыстоўваюцца worныя землі ў нашай малой краіне. Пры Саветах за кавалак раллі ледзь не расстрэльвалі. А хто будуе на раллі? Можа, нашы бізнэсмены? Ды яны ў кар'ерах, у балоце будуюцца (паказвае на Юрыя Авяр'янава, які змог зрабіць аўтарынак на месцы былога кар'ера. — **Аўт.**). Мне кажуць: «Вазьмі ферму на 800 кароў, бо ў цябе там шмат грошай у Барысаве». А чаму не сказалі: «Віктар Іванавіч, пабудуй лагістычны цэнтр на worнай зямлі?» І такім чынам мае дзеці, прабачце за выраз, будуць гной насіць, а нямецкія і іншыя бізнэсмены будуць займацца лагістыкай у Беларусі.

Віктар Хіневіч звярнуў увагу прысутных на тое, што замежны бізнэс сюды вельмі лёгка прыходзіць таму, што ў іх ёсць магчымасць прыцягнуць крэдытныя рэсурсы пад нізкі працэнт, а беларускаму бізнэсу крэдыты даступныя толькі працэнтаў пад 60...

Бізнэс дзяржаве давярае, але хоча мець зямлю ў прыватнай уласнасці?

Таксама Віктар Іванавіч звярнуўся да прадстаўнікоў бізнэсу з прапановай: яшчэ раз ад імя дзелавога асяроддзя звярнуцца ва ўрад для таго, каб неяк вырашыць пытанне з правам прыватнай уласнасці на зямлю:

— Зямля знаходзіцца не ў прыватнай уласнасці. Якія ў нас гарантыі, што праз нейкі час дзяржава не захоча тут ладзіць свой бізнэс? Можа, нам яшчэ раз сёння звярнуцца з гэтай праблемай і акцэнтаваць увагу на тым, што развіццё бізнэсу ў такіх аб'ёмах магчымае толькі хоць бы пры ўмове атрымання ў спадчыну зямлі?

Юрый Авяр'янаў адзначыў, што ён таксама не мае права прыватнай уласнасці на зямлю пад сваімі гандлёвымі цэнтрамі:

— Мы не ініцыюем набыццё зямлі пад нашым аб'ектам, бо калі б гэта быў кар'ер, то ён бы каштаваў 3 капейкі. А сёння мы зрабілі магутны гандлёвы пункт і цана нашай зямлі ўжо будзе як мінімум 10 мільёнаў долараў за гектар. Атрымліваецца, што я сам сабе падняў цану. Таму хай зямля ў мяне застанецца ў пастаянным карыстанні. Я веру дзяржаве, што яна не прагоніць.

Праверкі: як і бізнэсу не замінаць, і бяспеку забяспечыць?

На пасяджэнні таксама прысутнічаў прадстаўнік ад Генеральнай пракуратуры. Па яго словах, пасля прыняцця Дырэктывы № 4 органы пракуратуры і бізнэс сталі лепей разумець адзін аднаго:

— З прыняццем гэтай дырэктывы мы трохі актывізавалі (у добрым разуменні гэтага слова) супрацоўніцтва з прадстаўнікамі бізнэсу ва ўсіх сферах. Адпраўным пунктам было абмеркаванне пытання, звязанага з рэалізацыяй 510-га ўказа аб кантрольнай і наглядной дзейнасці, — расказвае **Павел РАДЗІВОНАЎ, начальнік упраўлення па наглядзе за выкананнем заканадаўства і законнасцю прававых актаў Генеральнай пракуратуры.**

Ён патлумачыў, што пракуратура пагадзілася з бізнэсам — кантрольная дзейнасць, якую ажыццяўляюць падатковыя органы, дэпартамент фінансавых расследаванняў, часам стварала складанасці ў дзейнасці прадпрымальнікаў. Але пры гэтым Павел Радзівонаў глыбока перакананы, што наглядная дзейнасць органаў пажарнай бяспекі, пракуратуры, службаў санітарнага нагляду, інспекцыі па працы не павінна абмяжоўвацца нейкімі рамкамі:

— Дайшло, шчыра кажучы, да абсурду, калі інспекцыя па працы павінна за месяц папярэджваць, што яны прыйдуць правяраць, скажам, аб'ект будаўніцтва. На вуліцы Інтэрнацыянальнай, дзе знаходзіцца будынак Генпракуратуры, я штодзённа магу назіраць, як побач на будоўлі гасцініцы работнікі ходзяць без страховачных паясоў. Дык што, інспектар па працы павінен за месяц папярэдзіць аб праверцы? Не, вядома. Сусветная практыка паказвае, што наглядныя органы не павінны будаваць сваю дзейнасць на планавасці праверак. Яны павінны быць неспадзяванымі, каб у любы час інспектар ці пракурор мог прыйсці і праверыць, ці выконваюцца элементарныя патрабаванні заканадаўства.

Але прадпрымальнікі не зусім пагаджаюцца з такой пастаноўкай пытання. Напрыклад **Мікалай СТРЫЖ, генеральны дырэктар ААТ «Прамень»,** лічыць, што несістэмныя праверкі даюць вельмі моцны інструмент для ціску на бізнэс:

— Магчыма, вы маеце рацыю, але несістэмныя праверкі — гэта такі інструмент, які можа выкарыстоўвацца на шкоду. Вось мне падпісалі праект, дзе ёсць патрабаванне пяцідзесяці метраў ад крыніцы забруджання. Праз паўгода памяняліся нормы і адлегласць была павялічана да 100 метраў. А што мне рабіць — сотні мільёнаў ужо ўкладзены ў праект?... Ці яшчэ канкрэтны прыклад: пабудавалі інтэрнат, паклалі лінолеум — усё па праекце. Прыходзіць пажарны і кажа: «У нас умовы памяняліся, памяняйце ўсё на плітку». І тэрмін дае — тры месяцы. Каштуе гэта мільярд рублёў, а мы ж працуем у рэжыме канкрэтнага планавання. Хіба так можна?

Прывялі бізнэсмены і яшчэ выпадак, калі наглядныя органы выпісваюць прадпісанні, не ўнікаючы ў дэталі: ёсць адміністрацыйны будынак, пабудаваны ў 1985 годзе і па тэхнічных нормах таго часу. І там ёсць запасны выхад з вышынёй праёму — 1,9 метра. А сённяшнія пажарныя нормы патрабуюць больш высокіх праёмаў. І павялічыць выхад нельга, бо сценка з'яўляецца апорнай... Таму прадпрымальнікі звярнуліся з просьбай да прадстаўніка Генпракуратуры: паколькі зараз заканадаўства аб кантрольнай і наглядной дзейнасці плануецца ўдасканаліць, то было б вельмі добра ўвесці такі механізм, каб прадпісанні наглядных органаў можна было абскардзіць або растлумачыць, чаму немагчыма іх выканаць.

Павел БЕРАСНЕЎ.

ЗА АКІЯН З ПУСТЫМІ КІШЭНЯМІ

Як у Калумбіі беларусаў пасялілі ў дом са слугамі

Частка 2

Нікарагуа. Вяскоўцы побач з трактарам «Беларус».

У папярэднім матэрыяле мы пісалі, як наша сямейная пара вылятала ў Нью-Ёрк (нумар за 28 кастрычніка).

Падрабязна распавядалася, якім чынам журналістка Жэня і геолаг Верасень зарабілі грошы, як амаль за бясплатна вандравалі па ЗША і Мексіцы, мінуўшы «крымінагенную» сталіцу свету Сьюдад-Хуарэс. Дзе жылі і што елі. Наступны этап падарожжа — гэта не іначай як лацінаамерыканскі серыял.

Хоць нават у 90-я ў бразільскіх, аргентынскіх ды мексіканскіх серыялах такога не паказвалі...

Раз за разам перапытваю ў Верасня пра самы «крымінагенны» горад свету Сьюдад-Хуарэс, які яны праязджалі. Як ні круці, летась тут забілі 3,1 тысячы чалавек з-за наркатычных міжусобіц.

Не так даўно, 12 кастрычніка гэтага года, у горадзе за адзін дзень забілі трох пракуроraў, шасцярых паліцэйскіх і шасцярых цывільных людзей.

Але на ўсе гэтыя факты Верасень паціскае плячыма і разважліва пацягвае матэ праз бамбілью. Для беларускай пары, куды ні ткніся, паўсюль жывуць добрыя і пазітыўныя людзі.

Такім чынам, Верасень з жонкай спыніліся ў мексіканскай сталіцы.

Так беларусы пераляталі грузавым самалётам у Калумбію.

ДЗЕ ВЕДАЮЦЬ ПРА БЕЛАРУСЬ І ЯК БЯСПЛАТНА ЛЯТАЦЬ САМАЛЁТАМ?

— Калі распавядаць пра кожную краіну, дзе мы пабывалі, то не хопіць цэлай газеты, — *папярэджвае мяне Верасень, падліваючы кіпень у калабасу.* — З Гватэмалы мы паехалі ў Гандурас, а з Гандураса — у сельскагаспадарчую краіну Нікарагуа. Тут пра Беларусь чулі. У Нікарагуа прывозяць трактары «Беларус», якія карыстаюцца папулярнасцю. Такія аблегчаныя версіі — з адкрытай кабінай.

З Нікарагуа мы адправіліся ў Коста-Рыку, вельмі прыгожую краіну. Тут пазнаёміліся з чалавекам, які сачыў за лесам. Ён запрасіў нас пажыць у сваёй сям'і. Гэта ў Сан-Хасэ — сталіцы. Потым мы адправіліся на ўзбярэжжа Ціхага акіяна. Нас запрасіла сюды дзяўчына з Румыніі, якой спадабаліся беларускія спевы. Румынка мае бізнэс у Коста-Рыцы, утрымлівае хостэл. Тут я на сабе паспрытаў, што такое сёрфінг.

З Коста-Рыкі мы трапілі ў Панаму, адтуль пераляцелі на самалёце ў Калумбію.

— Выходзіць, хацелі спыніць фуры, а спыніўся самалёт?

— У Калумбію нас перавёз уладальнік грузавой авіякампаніі, з якім мы пазнаёміліся ў Панаме. І сам прапанаваў: «Паляцелі са мной».

У Калумбіі мы таксама прабылі каля месяца. Дарэчы, у Калумбіі вельмі прыгожыя людзі — прычым паўсюль: прадаўшчыца прыгожая, які-небудзь менеджар — таксама. Культура там трошкі іншая. Сядзяць кампаніі, паляць вогнішчы, кураць. Нібыта спажываць наркатычныя рэчывы нельга, але многія гэта робяць адкрыта. Вельмі характэрны пах.

Калумбія — краіна вельмі багатая, вельмі развітая. Ёсць бедныя людзі, але ёсць і вельмі забяспечаныя. Дырэктар грузавой кампаніі даў нам кантакты сваіх сяброў і сваякоў. Такім чынам, у Калумбіі мы жылі ў мясцовых арыстакратаў — іспанцаў, якія некалі прыехалі сюды і засталіся. Вось у іх, напрыклад, лецішча. Гэта некалькі гор, з пяццю мастамі, сямю дамамі. Там ёсць слугі. Дамы разлічаны так, што ёсць асобныя пакоі і санвузлы для слуг. Для нас гэта было незвычайна. У нас і інтэлігенты, і бізнэсмены — усе самі могуць памыць посуд, пачысціць бульбу. А там можа жыць адзін чалавек, а ў яго пяць слуг. Так разам са слугамі мы пражылі месяц...

ЯК ВЫГЛЯДАЕ РАЙ?

У Мехіка мы прабылі тыдзень. Даволі цікавая архітэктура. Засталося шмат каланіяльных будынкаў у іспанскім стылі.

Спрабавалі зрабіць візы ў Калумбію, але аказалася, што гэта няпроста. Нам сказалі, што гэта будзе рабіцца на працягу месяца. Тады мы вырашылі, што паедзем далей — у горад Каацакаалькас штата Веракрус. Гэта ў Мексіканскім заліве. І там у нас быў сапраўдны фестываль. Усяго падчас вандроўкі мы «правялі» сем фестываляў нацыянальнай культуры. Спявалі беларускія песні пад скрыпку і гітару.

— Вы самі арганізоўвалі фестывалі? Вось так стыхійна?

—Так, стваралі бюджэт, скідваліся па 10 баксаў. Нас з ЗША выехала каля 10 чалавек, вандравалі на розных фурах і дамаўляліся сустрэцца ў пэўны дзень у пэўным месцы. Прыязджалі, спісваліся ў інтэрнэце. Потым ішлі да чыноўнікаў, бралі дазвол. Калі было неабходна, прасілі тэхніку, напрыклад, пражэктар нам патрэбны быў. Знаёміліся з мясцовай крэатыўнай моладдзю.

Начавалі таксама ў мясцовых людзей. А калі былі за горадам, то — у намёце.

— Дык як вы камунікавалі з мясцовымі? Вы ж па-іспанску ні ля-ля...

— Гэта быў экспрэс-курс іспанскай мовы, і ў хуткім часе мы маглі размаўляць. У Мексіцы мы таксама прабылі цэлы месяц.

— І што найбольш уразіла?

— У Мексіцы ёсць такі паўвостраў Юкатан. З аднаго боку — Мексіканскі заліў, з іншага — ужо Карыбскае мора. Я не ўяўляў, што бываюць такія цудоўныя мясціны на зямлі. Калі прыехалі да Карыбскага мора, паплылі на востраў Ісла мухерас, што ў перакладзе азначае «востраў Жанчын». Калі мы туды прыплылі, я зразумеў: вось так выглядае рай. Бірузовае мора, блакітнае неба. Я думаў, такія карцінкі можна зрабіць толькі ў фоташопе. Уражанні былі нечуваныя. Там мы цэлы тыдзень валяліся ў хвалях, але больш не вытрымалі.

Калі мы туды прыплылі, я зразумеў: вось так выглядае рай. Бірузовае мора, блакітнае неба. Я думаў, такія карцінкі можна зрабіць толькі ў фоташопе. Уражанні былі нечуваныя. Там мы цэлы тыдзень валяліся ў хвалях, але больш не вытрымалі.

НА ЧЫМ ВАНДРАВАЦЬ ПА МЕКСІЦЫ І ШТО ЕСЦІ?

— А што елі-пілі ў Мексіцы?

— Усю мясцовую ежу. У Мексіцы самая цікавая кухня з усёй нашай вандроўкі. У іх шмат чаго звязана з вострым перцам чылі. Да Мексікі я яго ўвогуле не спажываў. А тут аказалася, што існу іншая ежа, іншая філасофія гэтай ежы. Праўда, спачатку пакутаваў на расстройства страўніка ад гэтага ўсяго. Але потым я прызвычаіўся. Вельмі спадабаліся кукурузныя ляпёшкі такас, з начыннем. Шмат садавіны, якую немагчыма давезці да нас.

— А цэны як там?

— Паесці на вуліцы танней, чым у нас. Таму што ў нас няма фаст-фудаў. Сталоўку, калі ты прыязджы, не знойдзеш, а ў рэстаране трэба шмат заплаціць. У іх паўсюль разнастайныя фаст-фуды.

— А людзі моцна адрозніваюцца ад нашых?

— У Лацінскай Амерыцы людзі заўжды вітаюцца. Паўсюль апроч Гандураса. Нават калі гэта паліцэйскі, ты можаш павітацца, і няма гарантыі, што ў цябе не праверадь дакументы.

— Няўжо і ў Лацінскай Амерыцы да вас не чапляліся паліцэйскія?

— Ды не. Хоць у Мексіцы ідзе антынаркатычная вайна і шмат дзе стаяць блокпасты. Прычым хлопцы стаяць з аўтаматычнай зброяй. Калі цябе спыніць паліцэйскі, то ён будзе ў шлеме, у акулярах, у бронекамізэльцы, з аўтаматам нармальным. Банкі ахоўваюць хлопцы з «вінчэстарамі». На ўваходзе ў кавярню таксама можа стаяць нехта з аўтаматам.

— Вандруючы па Мексіцы, вы жылі толькі ў новых сяброў?

— Так. А яшчэ там шмат пірамід мая. Гэта старажытныя комплексы кшталту нашых цэркваў. Напрыклад, мы знаходзімся дзесьці ў джунглях. Размаўляем з ахоўнікам, што нам трэба дзесьці пераначаваць. Ён нас пускае. Мы ставім намёт на пірамідах, начуем, а зранку выязджаем далей. Калі выязджалі з Мексікі, то ўжо размаўлялі па-іспанску.

— А на чым ездзяць па Мексіцы? Якія машыны вас падбіралі? Фуры?

— Не толькі. Там самыя папулярныя аўто — пікапы. У кабіне змяшчаецца пяць чалавек, а ў кузаве можа ехаць чалавек 25.

Так мы дабраліся да мяжы з Гватэмалай. Мексіканцы таксама казалі: «Не ездзьце ў Гватэмалу, там вельмі дрэнна, там вас заб'юць. Заставайцеся». Прыязджаем у Гватэмалу, а там увогуле рай. Ні разу не патрацілі грошай...

КРАЙНІЯ?..

Суб'ектыў

На мінулым тыдні адбылося чарговае пасяджэнне Брэсцкага аблвыканкама, на якім былі падведзены вынікі работы народнай гаспадаркі за дзевяць месяцаў 2011 года.

Як расказала абласная прэса, адзначалася, што хоць валавы рэгіянальны прадукт у вобласці і расце, аднак тэмпы яго росту замарудзіліся і паказчыкі па Брэсцкай вобласці ніжэйшыя, чым у іншых рэгіёнах Беларусі. Большасць раёнаў Брэстчыны не выканала план вытворчасці малака, а недапастаўкі ялавічыны дасягнулі 12 тыс. тон. Недабралі ў вобласці і збожжа.

Вялікія цяжкасці ўзніклі ў Бярозаўскім, Драгічынскім, Кобрынскім, Лунінецкім, Маларыцкім, Пружанскім раёнах, а вось кіраўнікам Ганцавіцкага і Столінскага раёнаў прапанавалі напісаць заявы аб адстаўцы. У нямаласць трапілі два старажылы. Уладзімір Столяр кіраваў раёнам больш за 10 гадоў, а Аляксей Дзямко — 9 гадоў.

Хачу звярнуць толькі ўвагу на гэтыя праблемна-спецыфічныя раёны. Кожны, хто быў на Століншчыне, мог убачыць, што мясцовы народ вельмі прадпрымальны. Ужо нагналі аскому размовы пра цяпліцы, агуркі і фуры, якія сотнямі едуць сюды з Расіі. Людзі выжываюць самі — не чакаюць, калі ім дзяржава нешта прапануе. А яшчэ вёскамі прыходзяць у райвыканкам і просяць зямлі, хоць могуць і патрабаваць: гэта зямля іх дзядоў і бацькоў, якую некалі сілай забралі. А ці мае права кіраўнік раёна распусціць сельгаскааператыў і раздаць ці прадаць зямлю людзям? Не, бо няма заканадаўчай базы. Мы працягваем жыць у сацыялізме і не хочам, каб у сельскай гаспадаркі нешта мянялася, робім стаўку на СВК і патрабуем ад іх паказчыкаў. Надоі, цэнтнеры, працэнты з года ў год павінны толькі расці, і з кожнай пяцігодкай неабходна браць новыя рубяжы. Дык вось шэраг раёнаў Брэстчыны праваліў першы год пяцігодкі, і сярод іх аказаліся Столінскі і Ганцавіцкі. Але калі мы складалі план на пяцігодку, то павінны былі ў ім указаць, што летам 2011 года, у першы год пяцігодкі, на Ганцаўшчыне пранясецца градавы шквал і паб'е пэўны працэнт палеткаў, а ў наступным годзе будуць замаразкі, засуха ці ўраджай вымакне.

Чамусьці забылі, што пастановай Урада №514 ад 1 красавіка 1998 года Ганцавіцкі раён, адзіны на Брэстчыне, быў уключаны ў спіс раёнаў, якія «знаходзяцца ў кепскіх прыродна-кліматычных, экалагічных і эканамічных умовах».

Меліяраваная зямля, а яе ў раёне 80%, вельмі рэагуе на пагодныя ўмовы, і не толькі. Нават за савецкім часам, калі асушаныя тарфянікі бязмерна «кармілі» мінеральнымі ўгнаеннямі, не шкадавалі хімікатаў і былі грошы на падтрымманне меліярацыйных сістэм у парадку, тут рэкордных ураджаяў не збіралі.

Ляхавіцкі раён сёння ходзіць у лідарах, але ў палескай зоне, якая мяжуецца з Ганцавіцкім раёнам, пахваліцца няма чым. У Тухавічах, Свяціцы, Ліпску... важкіх цэнтнераў і высокіх надояў спрадвеку не было. Раён выцягваюць СВК, якія знаходзяцца на землях Радзівілаўскай грады.

Да кожнай мясцовасці неабходны індывідуальны падыход. А хто гэтым у нас займаецца? Усё круціцца наўкол планаў, пяцігодак, валу, паказчыкаў. А што стаіць за тымі цэнтнерамі і працэнтамі? Якое рэальнае становішча? Колькі надаілі малака і які сабралі ўраджай, мы ведаем і нават любім пахваліцца. А вось колькі ў зямлю і фермы грошай укладзі — не кажам. І тут неабходна ўлічыць спісаныя і адтэрмінаваныя трыльёны. Можа, у многіх сельгаскааператывах ды і раёнах «аўчынка вырабу не варта»?

Вось яскравы прыклад. У Савецкім Саюзе падымалі цаліну, асушвалі балоты, штурмавалі чарговую пяцігодку, а збожжа закуплялі за мяжой. Сёння ў некаторых абласцях Расіі палі параслі хмызняком, а краіна выйшла па імпарце збожжа на другое месца ў свеце — уступіла толькі Амерыцы.

Калі зямля прыносіць не прыбытак, а страты, то, можа, за лепшае будзе засадзіць яе лесам? Будучыя пакаленні падзякуюць.

Усё мае сваю мяжу, і ёсць землі, з якіх не возьмеш больш, чым яны могуць даць. Для нас усё яшчэ важнае значэнне мае камуфляж: каб зямля не пуставала, каб усё было засеяным, прыгладжаным... А калі аддачы няма, то які ў гэтым сэнс?

Мы ўсё яшчэ хочам захаваць сельскую гаспадарку ў некранутым савецкім стане. На тым пасяджэнні прапанавалі адмовіць у дзяржаўнай падтрымцы тым аб'ектам гаспадарання, якія не выконваюць прагнозныя паказчыкі. Але пункт аб дзяржаўнай падтрымцы ў праекце аблвыканкама пакінулі... Безумоўна, аграпрамысловы комплекс не можа выжыць без дат

«Шанц на жыццё ёсць у кожнага»

У Мінску прайшла дабрачынная акцыя «Чырвоная сукенка»

Тут амаль усе былі ў чырвоным: мадэль Ганна Малібога, спявачка Анастасія Ціхановіч, жонка былога прэм'ер-міністра Беларусі Сяргея Сідорскага... Што аб'ядноўвае гэтых людзей? Імкненне дапамагчы людзям, якія пакутуюць на хворае сэрца. Акцыя «Чырвоная сукенка», якая прайшла ў сталіцы ўжо другі раз, звярнула ўвагу грамадскасці на праблему сардэчна-сасудзістых захворванняў — усе сродкі, сабраныя ў гэты дзень, пойдуць на дабрачыннасць.

Мерапрыемства, арганізаванае ў Нацыянальнай школе прыгажосці, сабрала шмат гасцей, большасць з якіх было лёгка пазнаць у твар. Акрамя артыстаў эстрады, мерапрыемства падтрымалі прадстаўніцы і Мінскага міжнароднага жаночага клуба жонак паслоў і дыпламатаў.

Дэфіле ў чырвоных сукенках нагадала прысутным пра сэнс акцыі: чырвоны колер — сімвал змагання за жыццё.

Адным з кульмінацыйных момантаў вечара стаў продаж палатна, на якім кожны з прысутных мог пакінуць адбіткі сваіх далоняў. Напамін пра тое, што ўсе мы роўныя і шанц на жыццё ёсць у кожнага...

Мікола БРОВАР. Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

СКАНВОРД + СУДОКУ

Склаў Яўген ЛЯХАЎ.

СУДОКУ. У квадраце 9×9 клетак размясціце лічбы ад 1 да 9 уключна такім чынам, каб у кожным радку, кожным слупку, у блоках 3×3 клетці, абмежаваных тлустай лініяй, кожная лічба сустракалася толькі адзін раз, без паўтораў.

								3
3		6			9			7
	2		8		3	1	9	
		9	6	2				
		4	1		8	2		
				7	4	6		
	9	5	2		6		7	
7			5			4		2
2								

АДКАЗЫ НА СКАНВОРД + СУДОКУ

Па гарызанталі: Сцяна. Ашыпок. Гнюс. Улад. Пта. Кола. Шпіталь. Лбоў. Мэн. Сагава. Ана. Глуза. Рэмек. Арал. Зюйд. Агат. Заяц. Лыжа. Азон. Ліда. Ліхтар. Аўчарка. Самарэц. Лагатып. Аўчарка. Ліда. Лаціо. Дзядзюлька. Вырва